Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 САКАВІКА 2016 г. СУБОТА № 43 (28153) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## НАТХНЯЛЬНІЦЫ НА НОВЫЯ ЗДЗЯЙСНЕННІ І ПЕРАМОГІ

***Дарагія суайчынніцы!***

*Сардэчна віншую вас са святам 8 Сакавіка.*

*У гэты цудоўны вясновы дзень мы гаворым цёплыя словы павагі, удзячнасці і любові маці, бабулям, жонкам, дочкам, дарагім для нас жанчынам. Дзякуй, што ідзяце па жыцці побач з намі, падтрымліваеце добрым словам, дапамагаеце мудрай парадай і натхняеце на новыя здзяйсненні і перамогі.*

*Спрадвеку жанчыну шануюць як захавальніцу дамашняга ачага, а сёння многія з вас паспяхова сумяшчаюць клопат аб сям'і і прафесійную дзейнасць. Прыміце шчырую ўдзячнасць за працу на ніве аховы здароўя, адукацыі і дзяржаўнага кіравання, за плённую работу на вытворчасці і дасягненні ў галіне культуры і навукі.*

*Мы высока цэнім ваш актыўны ўдзел у справах краіны, бясцэнны ўклад у выхаванне падрастаючага пакалення, захаванне традыцый і маральных каштоўнасцяў.*

*Ад усёй душы зычу вам моцнага здароўя, шчасця, міру і дабра.*

**Прэзідэнт**
**Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Паўднёвы Усход

Сумесны праект газеты «Звязда» і Магілёўскага аблвыканкама

## ШЧАСЛІВАЯ СЯМЁРКА МАГІЛЁЎШЧЫНЫ

**Летась у Магілёўскай вобласці была зацверджана праграма, якая павінна даць дадатковы імпульс развіццю эканамічнага патэнцыялу сямі раёнаў вобласці — Крычаўскага, Клімавіцкага, Касцюковіцкага, Краснапольскага, Слаўгарадскага, Чэрыкаўскага і Хоцімскага. Указам №235 для гэтага прадугледжаны сур'ёзныя льготы і прэферэнцыі, якія вельмі прывабныя для бізнесу і цікавыя для насельніцтва. Праграма будзе спрыяць стварэнню новых працоўных месцаў, будаўніцтву жылля, адным словам — росквіту. Стаўка робіцца на тое, што ў раёны прыйдзе бізнес, а мясцовыя жыхары змогуць рэалізаваць свае найбольш перспектыўныя ініцыятывы. У рамках сумеснага з Магілёўскім аблвыканкамам праекта «Паўднёвы Усход» «Звязда» раскажа, як рэалізуюцца нормы ўказа, наколькі яны цікавыя прадпрымальным людзям. На пачатку мы наведалі Чэрыкаўскі раён і на свае вочы паглядзелі, як тут працуе праграма.**

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

# ПЕРШЫЯ КРОКІ ВЯСНЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Маленькая мінчанка Юлія РАБКАВЕЦ рыхтуецца да свята ўсіх жанчын.

# ЖАНЧЫНА ПОСПЕХАМ НЕ АБМЯЖОЎВАЕЦЦА

**У гэтыя дні ў руках беларускіх жанчын — рознакаляровыя кветкі, на тварах — усмешкі, а ў вачах радасны агеньчык ад мужчынскіх цёплых пажаданняў. У гэты перадсвяточны час, у атмасферы святкавання Міжнароднага жаночага дня па ініцыятыве часопіса «Алеся» і газеты «Звязда» за «круглым сталом» «Партрэт сучасніцы: беларуская жанчына сёння» ў Доме прэсы сабраліся выбітныя, паспяховыя жанчыны — парламентарыі, журналісткі, дзеячы культуры і навукі, спорту, праваахоўных органаў.**

«Калі ў нашым грамадстве лад ды згода, то відаць, сучасніцы адыгралі ў гэтым не апошнюю ролю. Мы не можам быць незадаволеныя і гэтай вясной, і гэтым спакойным цудоўным днём, і тым, як развіваецца наша краіна», — упэўнена **Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі**.

Яна выказала задавальненне тым вобразам жанчыны, які сёння адлюстроўваецца ў сродках масавай інфармацыі. Міністр падкрэсліла, што сярод удзельніц «круглага стала» ёсць банкір, літаратар, дэпутаты, псіхолаг і нават міліцыянер.




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Сярод удзельніц «круглага стала» была і **Надзея ЕРМАКОВА, намеснік старшыні Беларускага саюза жанчын**. На яе думку, галоўнае прызначэнне жанчыны — быць добрай маці. «Яна — прадаўжальніца роду, выхавальніца новага пакалення — сваіх дзяцей і пасля ўжо і ўнукаў. Гэта галоўная роля, якая дадзена жанчыне прыродай і Богам. Хоць у той жа час жанчына не можа быць раўнадушнай да ўсяго, што адбываецца вакол», — лічыць Надзея Андрэеўна.

Эмансіпацыя сучасных жанчын набірае абароты, і шмат хто з асоб слабага полу займае кіруючыя пасады ў самых розных сферах. Што да беларусак, то ім дарога да высокай пасады цалкам адкрыта, як лічыць Надзея Ермакова. Але пры выкарыстанні такой магчымасці важна не пераацаніць уласныя здольнасці. «Калі ты кіраўнік на прадпрыемстве, у органах улады, парламенце, галоўнае — прыносіць карысць. Як ты прыносіш яе сваім дзецям, сваёй краіне», — дадала яна.

За «круглым сталом» таксама вялі гутарку дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Алена Бераснева і Зінаіда Мандроўская, сенатар Святлана Сарока, алімпійская прызёрка Ксенія Санковіч, пісьменніца Людміла Рублеўская, кандыдат псіхалагічных навук Ірына Аксючыц ды іншыя. Больш падрабязна аб тым, якой бачаць сучасную жанчыну гэтыя выбітныя беларускі, чытайце ў найбліжэйшых нумарах газеты «Звязда».

**Вераніка ПУСТАВІТ.**

# ВЕРНЫЯ СВАЙМУ ПРЫЗВАННЮ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка напярэдадні 8 Сакавіка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўніцам прыгожай паловы чалавецтва.**

«Гэта свята асацыюецца з абуджэннем прыроды пасля зімовага сну, прыгажосцю і вечным адраджэннем жыцця. І глыбока сімвалічна, што гэты выдатны дзень прысвечаны менавіта вам — прыгожай палове чалавецтва», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў пажаданне, каб і мужчыны, і ўсё грамадства ўдзялялі такую ўвагу жанчынам не толькі ў дні гэтага свята, а заўсёды.

Прэзідэнт падкрэсліў тую вялікую ролю, якую адыгрываюць жанчыны ў грамадстве. Складаючы большасць насельніцтва Беларусі, жанчыны ўносяць неацэнны ўклад ва ўмацаванне маладой суверэннай дзяржавы, развіццё ўсіх яе сфер і забеспячэнне шчаслівай будучыні. «Прыемна бачыць, што нашы сучасніцы не застаюцца ў баку ад самых актуальных праблем сённяшняга жыцця, асвойваюць перспектыўныя прафесіі, найноўшыя тэхналогіі. І ў той жа час захоўваюць найлепшыя душэўныя якасці, выяўляючы талент мацярынства і клопату аб падрастаючым пакаленні», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў словы ўдзячнасці працаўніцам сельскай гаспадаркі, айчыннай сістэмы аховы здароўя, педагогам, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Дзяржаўныя ўзнагароды былі ўручаны дырэктару ААТ «Старобінскі» Салігорскага раёна, начальніку шпіталя МУС, дырэктару брэсцкай сярэдняй школы № 20. У ліку ўзнагароджаных — работніцы прадпрыемстваў «Белпошта» і «Белтэлекам», супрацоўніцы памежнай і мытнай службаў, артысты Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі і Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, а таксама спартсменкі, якія паказалі выдатныя вынікі ў такіх відах спорту, як вольная барацьба і цяжкая атлетыка.

«Але самая складаная, адказная і важная прафесія на зямлі — гадаваць і выхоўваць дзяцей. Вось тут без вас нікуды», — адзначыў Прэзідэнт, уручаючы ордэны Маці жанчынам, якія выхоўваюць пяць і больш дзяцей. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў ім за тое, што з мноства жыццёвых шляхоў яны выбралі найбольш высакародны і важны для краіны — мацярынства. «Гэта найвялікшы дар і самы вялікі цуд на зямлі. Таму што, як казаў народны пісьменнік Янка Брыль, дзеці — сведчанне вечнасці», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў словы шчырай удзячнасці жанчынам за самаадданае служэнне свайму прызванню. «Няхай ганаровыя званні, ордэны і медалі стануць бачным увасабленнем той павагі, якую вы заваявалі ў сваіх калектывах, і падарункам да надыходзячага Дня жанчын», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён пажадаў усім здароўя, шчасця, невычэрпнай энергіі, шчырай любові родных і блізкіх, здароўя дзецям.

■ Партрэт суайчынніцы

# ПРЫГОЖЫЯ І АКТЫЎНЫЯ Ў ЛЮБЫМ УЗРОСЦЕ

## Гарадскія жанчыны маладзейшыя за вясковых на 7 гадоў

**Дзе працуюць нашы жанчыны? Колькі сярод іх кіраўнікоў і навукоўцаў? І ці ўдаецца беларускам сумяшчаць кар'еру і сям'ю?**

### Краіна працоўных жанчын

На пачатак гэтага года, паведамляе Белстат, у Беларусі налічвалася 5,1 мільёна жанчын (53,5 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва). Атрымліваецца, што на кожную тысячу прадстаўніц прыгожага полу прыпадае ўсяго толькі 871 мужчына. Большасць беларусак — 78 працэнтаў — жыве ў гарадской мясцовасці. І толькі пятая частка застаецца на сяле.

Сярэдні ўзрост нашых жанчын — 42,4 года. Прычым сярэднестатыстычная гарадская жыхарка на 7 гадоў маладзейшая за вясковую!

Што да месца працы беларусак, то 23 працэнты звязалі сваю дзейнасць з прамысловасцю, 18,5 — пайшлі ў галіну адукацыі, 14,5 — у гандаль. Аховай здароўя і прадастаўленнем сацыяльных паслуг займаюцца 13 працэнтаў жанчын, сельскай і лясной гаспадаркай — каля 8 працэнтаў. Цікава, што пераважна жаночымі застаюцца такія віды эканомікі, як фінансавая дзейнасць, гасцінічны і рэстаранны бізнес, рамонт аўтамабіляў, бытавых вырабаў і прадметаў асабістага карыстання.

Сярод працоўных грамадзянак нашай краіны траціна мае вышэйшую адукацыю. Кожная чацвёртая скончыла сярэдне-спецыяльную навучальную ўстанову, яшчэ 17 працэнтаў — прафесійна-тэхнічную. Сярод даследчыкаў, якія займаюцца навуковымі распрацоўкамі, доля жанчын — 40 працэнтаў.




Паступовa змяншаецца разрыў у аплаце працы мужчын і жанчын. Сёння мужчынскі заробак перавышае жаночы на 23 працэнты. Найменшая розніца ў прыбытках назіраецца ў арганізацыях сельскай гаспадаркі (8,5 працэнта), цэлюлозна-папяровай вытворчасці і выдавецкай дзейнасці (11 працэнтаў), розничным гандлі (12 працэнтаў).

— Беларусь — краіна працоўных жанчын, — заўважае **старшыня Беларускага саюза жанчын Антаніна МОРАВА**. — Узровень занятасці сярод нашых суайчынніц складае 65 працэнтаў. З жанчын ва ўзросце ад 20 да 44 гадоў працуюць 88 працэнтаў, а з тых, хто мае непаўналетніх дзяцей, — 90 працэнтаў.

Антаніна Морава адзначыла таксама, што мы пазбавіліся ад жаночага беспрацоўя. Калі раней у структуры незанятых грамадзян доля прадстаўніц прыгожага полу складала 69 працэнтаў, то цяпер — 35. Больш актыўна беларусак запрашаюць на кіраўніцкія пасады. 48 працэнтаў з ліку начальнікаў — дамы. Прычым амаль палова з іх мае дзяцей. Беларусь адна з першых выканала мэты тысячагоддзя па ўдзеле жанчын у заканадаўчых органах улады. Так, доля жанчын у парламенце, пачынаючы з 2005 года, складае 30 працэнтаў, у органах выканаўчай улады мясцовага кіравання і самакіравання — 56 працэнтаў, сярод дзяржслужачых — 70 працэнтаў.

— Па індэксе гендарнай роўнасці Беларусь заняла 31-е месца ў свеце сярод 188 дзяржаў. А па індэксе гендарнага развіцця мы ўвайшлі ў першую групу краін. Гэта самы высокі паказчык на постсавецкай прасторы, — каментуе Антаніна Морава.

### 146 мільёнаў долараў для дзяцей

Хапае ў беларусак часу і на сям'ю. Па статыстыцы, на адну жанчыну прыпадае два дзіцяці.

— Многае робіцца для таго, каб павышаўся прэстыж не толькі мацярынства, але і бацькоўства, узмацняліся сямейныя сувязі. Каб былі добрыя ўмовы для нараджэння дзяцей, — кажа **намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА**. — Асноўныя захады па падтрымцы сем'яў былі зроблены ў рамках мінулай Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі. Сёння сістэма дзяржаўнай дапамогі ўключае 11 відаў выплат. Грошы выдаткоўваюцца больш, чым на 540 тысяч дзяцей. Пры гэтым ахоп дапамогай малых ва ўзросце да трох гадоў складае практычна 100 працэнтаў.

Увогуле за апошнія шэсць гадоў колькасць шматдзетных сем'яў вырасла на 17 тысяч. Сёння іх у краіне налічваецца 80 тысяч. Новыя задачы будуць вырашацца ў рамках дзяржаўнай праграмы «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016-2020 гады. Падпраграма «Сям'я і дзяцінства», апроч іншага, прадугледжвае стварэнне дзяржаўнага партала па пытаннях планавання сям'і, навучальнага модуля па рэпрадукцыйным здароўі.

А Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка сумесна з Мінпрацы і сацабароны і Беларускім саюзам жанчын запускаюць праект «Здаровая сям'я — здаровая нацыя».

— У аснове яго распрацоўкі — усведамленне, з аднаго боку, выключнай ролі жанчыны, маці, з іншага — педагогаў, — адзначыў **рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК**.

Праект разлічаны на два гады. Да красавіка праводзяць анкетаванне сярод студэнтаў, іх бацькоў і выкладчыкаў, каб вывучыць іх адносіны да сям'і і шлюбу. З мая 2016-га па кастрычнік 2017-га, з улікам вынікаў даследавання, будуць арганізоўвацца мерапрыемствы па прапагандзе сямейных каштоўнасцяў і распаўсюджванні пазітыўнага вопыту культуры сямейных адносін праз СМІ і інтэрнэт. Вынікам праекта стануць рэспубліканскі маладзёжны форум «Сям'я XXI стагоддзя» і нацыянальны форум «Здаровая сям'я — здаровая нацыя». Гэтыя акцыі запланаваны на лістапад—снежань 2017 года.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# ЗНІЗІЦЬ КОШТ КРЭДЫТАЎ,
## інакш развіццё прадпрымальніцтва будзе марудным

### У Палаце прадстаўнікоў абмеркавалі праграму дзейнасці ўрада на 2016–2020 гады

**Як дапамагчы малому і сярэдняму бізнесу, вырашыць праблему стратных прадпрыемстваў, знізіць сабекошт прадукцыі і штогод ствараць 50 тысяч працоўных месцаў? Гэтыя, а таксама іншыя пытанні, што маюць дачыненне да праграмы дзейнасці ўрада на 2016—2020 гады абмеркавалі ўчора на пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы. Плануецца, што дэпутаты разгледзяць праграму ў Авальнай зале ў самым пачатку вясновай сесіі.**

### ЗАНЯТАСЦЬ, ЭКСПАРТ, ІНВЕСТЫЦЫІ

**Віктар ВАЛЮШЫЦКІ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы**, звярнуў увагу, што ёсць Указ Прэзідэнта №78, які трэба ўлічваць падчас падрыхтоўкі праграмы дзейнасці ўрада. Больш за тое, на гэтым тыдні адбылася Асамблея дзелавых колаў. Такім чынам, і дэпутаты, і чыноўнікі маюць дастаткова матэрыялаў.

— Занятасць, экспарт, інвестыцыі праходзяць чырвонай ніткай праз усю праграму ўрада, якая разлічана на пяцігодку, — заявіў Віктар Валюшыцкі падчас размовы з журналістамі. — Тут вызначаны асноўныя падыходы ўрада: і ў пытаннях рэальнага сектара эканомікі, і ў пытаннях развіцця малога прадпрымальніцтва, і ў пытаннях, звязаных з пенсійнай рэформай.

Старшыня Пастаяннай камісіі звярнуў увагу на кошт крэдытаў, з-за якога развіццё прадпрымальніцтва тармозіцца. Гэта асноўны момант, якому ўрад павінен надаваць увагу, жадаючы развіваць малое прадпрымальніцтва.

Гаворачы пра тыя пытанні, якія ўзніклі ў яго асабіста падчас вывучэння праграмы ўрада, Віктар Валюшыцкі прызнаўся, што яны звязаны з рэальным сектарам эканомікі — як урад і рэгіёны бачаць сваю працу па ліквідацыі стратных прадпрыемстваў.

— Плануюць уводзіць у сельскай гаспадарцы інстытут даверных кіраўнікоў, — паведаміў ён і дадаў: — Я лічу, што гэты інстытут трэба ў парадку эксперымента імкнуцца прымяняць і ў рэальным сектары эканомікі на прамысловых прадпрыемствах.

Па словах старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы, будзе яшчэ ўводзіцца такі элемент, як інстытут карпаратыўнага кіравання.

### УЛАДЫ І БІЗНЕС: ЗНАЙСЦІ КАНСЕНСУС

— Яшчэ адна найважнейшая, на маю думку, пазіцыя, якая павінна атрымаць развіццё, — гэта дзяржаўна-прыватнае партнёрства, — лічыць Віктар Валюшыцкі. — У нас сёння ўжо амаль сфарміравана інстытуцыянальнае асяроддзе. Гэта пазіцыі, якія маглі б прывесці ў далейшым да стварэння новых працоўных месцаў і вырашэння многіх сацыяльных праблем.

Трэба даць магчымасць малому і сярэдняму бізнесу карыстацца фінансавымі рэсурсамі — тады ўзнікнуць і ідэі, і прапановы, і планы, і перспектывы...

### АДЫСЦІ АД ПЕРАКРЫЖАВАНАГА СУБСІДАВАННЯ

Падчас пасяджэння камісіі гутарка ішла і пра ўвядзенне субсідый на аплату жыллёва-камунальных паслуг. Па словах **першага намесніка міністра эканомікі Аляксандра ЗАБАРОЎСКАГА**, урад пастараецца зрабіць гэта да кастрычніка.

— Прыярытэтам праграмы з'яўляецца развіццё адраснай сацыяльнай падтрымкі грамадзян, — нагадаў намеснік міністра.

— Пытанне перакрыжаванага субсідавання я падымаў больш за два гады таму, — нагадаў старшыня Пастаяннай камісіі Віктар Валюшыцкі. — У праграме ўрада абазначана, што да 2018 года тэма перакрыжаванага субсідавання павінна быць скончана. Гэта патрэбна для таго, каб зняць вялікую нагрузку з рэальнага сектара эканомікі.

### ЭКАНОМІКА ПРЫРАСТАЕ, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА КРЫЗІС

— Урад сёння разглядае пытанні павышэння эфектыўнасці эканомікі, зыходзячы з трох узроўняў, — патлумачыў Аляксандр Забароўскі. — Па-першае, гэта ўзровень прадпрыемстваў, які мае на ўвазе павышэнне эфектыўнасці і зніжэнне выдаткаў, павышэнне якасці — у тым ліку і кіравання. Па-другое, галіновы ўзровень — гэта пытанні стварэння новых працоўных месцаў і прыцягнення інвестыцый. Патрэцяе, макраўзровень — пытанні макраэканамічнай збалансаванасці, зніжэння інфляцыі, росту даступнасці крэдытаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# УЗНАГАРОДЫ ЗА ДАБРЫНЮ

**Старыя людзі кажуць: «Адзін сын — не сын, два сыны — паўсына, тры сыны — сын». А сучасныя мамы падтрымліваюць гэту прымаўку і не баяцца нараджаць. Найлепшых са шматдзетных мам дзяржава адзначае на высокім узроўні. Так, учора старшыня Мінскага аблвыканкама Сямён ШАПІРА ўзнагароджваў цудоўных жанчын, якія выхоўваюць пяцярых і болей дзетак, ордэнам Маці. На Міншчыне сёлета ўжо 38 жанчын атрымалі такую ўзнагароду.**

Дарэчы, кожная з узнагароджаных жанчын атрымае і грашовую выплату, прычым многія сем'і ўжо распланавалі, як яе выкарыстаць.

— Мы цяпер будуем дом, трэба набываць мэблю і грашовая дапамога аказалася вельмі своечасовай, — прызнаюцца сужэнцы Уладзімір і Настасся Маслоўскія.

Прашу прабачэння ў Настассі, бо не верыцца, што такая маладая жанчына — шматдзетная мама.

— Так, мне 28 гадоў і ў мяне сапраўды пяцёра дзетак. Ёсць планы яшчэ на аднаго



Старшыня аблвыканкама заўважыў, што шматдзетныя мамы — «самыя мудрыя і добрыя людзі, якія цяпло свайго сэрца аддаюць дзеткам» і што надалей дзяржава будзе рабіць усё магчымае, каб дапамагаць ім, аказваць увагу такім сем'ям.

— Не разумею, што такое сям'я, у якой толькі адно ці два дзіцяці. Іх павінна быць многа! Дзеткі — наша шчасце! — заўважае Святлана Бабко з Клецка, у якой чатыры сыночкі і дачка. — Вельмі прыемна, што нас у нашай нялёгкай, адказнай і, можна нават сказаць, «пераживальнай» справе падтрымліваюць і словамі, і фінансава. Разумееш, што гэта гонар — быць шматдзетнай.

сынка, бо зараз у нас чатыры дачкі. Паміж дзеткамі розніца ў 2 гады. Калі малых было трое, нават жартавалі, што 2 гады мінаюць, час падціскае — трэба зноў нараджаць. Калі многа дзетак, і малым цікавей жывецца, і ў мамы іншы рытм жыцця. Хутка час праходзіць, і ў доме весела, і на душы. Безумоўна, бывае цяжка. Мы жывём у дзядулі, у прыватным доме, трымаем кур, свінак, дзеткі дапамагаюць на агародзе. Летам «сядзім» у лесе — грошы зарабляем на зборы ягад, грыбоў. Часу на адпачынак няма. Даводзіцца сутыкацца з такімі меркаваннямі, што шматдзетныя сем'і — горшыя. Мы даказваем, што гэта не так.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

**Міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ у Дзень беларускай міліцыі ўсклаў кветкі да манумента супрацоўнікам унутраных спраў і вайскоўцам МУС, якія загінулі пры выкананні службовых абавязкаў.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ПОМНІЦЬ І ШАНАВАЦЬ

Гэтай прахалоднай сакавіцкай раніцай панад Свіслаччу, непадалёк ад будынка Міністэрства абароны, сабралася шмат людзей. Афіцэраў, курсантаў, ветэранаў... Многія прыйшлі з кветкамі, каб аддаць даніну пашаны тым, хто шчыра служыў закону і ў мірны час, на жаль, загінуў ад рук злачынцаў.

— Служба ў органах унутраных спраў заўжды прадугледжвала наяўнасць такіх чалавечых якасцяў, як самаадданасць, храбрасць, адвага, — звярнуўся да прысутных міністр унутраных спраў. — І нашы калегі імі валодалі. Безумоўна, яны не ведалі, чым скончыцца іх апошні дзень, але ў цяжкую хвіліну яны зрабілі крок насустрач злу, не задумваючыся выканалі свой абавязак.

— Святочныя мерапрыемствы ў Дзень беларускай міліцыі кожны год пачынаюцца з успаміну пра тых, хто цаной свайго жыцця абараніў нашых грамадзян. І для нас, дзеючых супрацоўнікаў міліцыі, яны заўжды застаюцца ў сэрцах. З'яўляюцца прыкладам самаахвярнага служэння радзіме, — сказаў **журналістам Аляксандр КОБРУСЕЎ, намеснік міністра ўнутраных спраў.**

Як прызнаўся Аляксандр Аркадзевіч, сёлета ў святкаванні прафесійнага свята калегі з замежных краін не ўдзельнічаюць, аднак іх чакаюць у наступным годзе, калі наша міліцыя адзначыць 100-гадовы юбілей. У міністэрстве рыхтуюцца годна адзначыць гэтую дату. Ідзе рэстаўрацыя музея. Пра нашых міліцыянераў ужо пачалі здымаць мастацкі фільм, свет пабачыць і двухтомнае навукова-папулярнае выданне. У Мінску таксама плануюць усталяваць помнік гарадавому. Акрамя таго, запланаваны шэраг мерапрыемстваў, якія пачнуць рэалізоўвацца ўжо гэтым летам.

**Якаў ЖУРБІН.**

■ Метро

# БУДАЎНІЦТВА ТРЭЦЯЙ ЛІНІІ Ў РАЗГАРЫ



**А вагонны парк сталічнага метро плануецца масава абнавіць у 2020 годзе.**

Пра гэта журналістам паведаміў **намеснік дырэктара па будаўніцтве КУП «Мінскі метрапалітэн» Алег КРУГЛОЎ**. Па яго словах, 68 вагонаў працуюць у мінскім метро з 1984-га і 1986 гадоў. Нядаўна іх рэсурс быў падоўжаны да 2020 года, на гэты ж час прызначана масавае абнаўленне вагоннага парка, калі плануецца закупіць 60 новых вагонаў. Пытанне аб пастаўшчыку новых саставаў пакуль не разглядалася. Летась на аднаўленне збудаванняў мінскага метро, вагонаў і абсталявання было накіравана амаль 92 мільярды рублёў.

Сёлета асноўныя сілы метрабудаўцаў былі сканцэнтраваны на будаўніцтве першай чаргі трэцяй лініі метро, а дакладней чатырох першых яе станцый. Як расказаў **начальнік дырэкцыі па будаўніцтве Мінскага метрапалітэна Павел ЦАРУН**, летась пачалося будаўніцтва перасадачнага вузла паміж станцыямі «Плошча Леніна» і «Вакзальная» закрытым спосабам. Дарэчы, апошняя знаходзіцца ў стадыі актыўнага будаўніцтва, ужо каля 40 метраў яе платформы гатова. Цяпер заканчваецца ўзвядзенне тупікоў на станцыі «Кавальская Слабада», адбываецца перакладка інжынерных сетак на перасадачным вузле «Фрунзенская» — «Юбілейная плошча».

— Сёлета плануем выканаць збудаванне тунэляў у два бакі ад «Вакзальнай» да «Юбілейнай плошчы» закрытым спосабам з дапамогай механізаванага прахадчага комплексу, — паведаміў Павел Царун. — Завершым работы па перакладцы інжынерных камунікацый, пабудуем станцыю «Кавальская слабада». Прыступім і да работ у катлаване станцыі «Юбілейная плошча», а таксама ўзвядзём тупікі за ёй.

Пры адпаведным фінансаванні сёлета будуць распачаты і падрыхтоўчыя работы для будаўніцтва другога ўчастка трэцяй лініі з сямю станцыямі. Мяркуецца, што для іх пабудовы прыйдзецца знесці каля 100 будынкаў, як жылых, так і адміністрацыйных.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ВЯСНА СВАЁ ВОЗЬМЕ

Ужо ў нядзелю нас чакае пацяпленне, месцамі — да плюс 11 градусаў



У суботу тэрыторыя нашай краіны трапіць у зону паніжанага атмасфернага ціску, таму чакаецца воблачна з праясненнямі, паведамляюць спецыялісты гідраметцэнтра. Пераважна па паўночна-ўсходняй палове будзе ісці мокры снег і снег. Месцамі галалёд і наліпанне мокрага снегу. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла, па захадзе пры праясненнях — да 8 марозу. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад нуля да 5 цяпла, а па Брэсцкай вобласці месцамі — да плюс 7 градусаў.

Ужо з 6 сакавіка да нас пачне паступаць вільготнае і мяккае паветра з боку Міжземнага мора. Пацяплее. Чакаецца воблачна з праясненнямі. Уначы ў асобных раёнах невялікі снег, мокры снег, а ўдзень пераважна на заходняй палове кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Мінімальная тэмпература паветра ўначы яшчэ будзе трымацца ад 0 да мінус 6 градусаў, але па паўднёвым захадзе — ужо 1-4 цяпла. Вясна прыйдзе да нас менавіта ўдзень, калі будзе ад плюс 2 градусаў па поўначы да 11 цяпла па поўдні краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, надвор'е паднясе жанчынам на 8 Сакавіка свята сапраўднай вясны. Чакаецца, што ўдзень тады будзе плюс 3 — плюс 9 градусаў, а ў паўднёвых рэгіёнах — ажно да 10-14 цяпла. Толькі вось месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# МОДА — ДЛЯ ЎСІХ

Мадэлі з асаблівасцямі развіцця выйшлі на подыум

**Падчас міжнароднай выставы-кірмашу «Мода Італія», што праходзіць у нашай краіне ўжо шосты раз, на подыум упершыню выйшлі дзеці і маладыя людзі з асаблівасцямі развіцця. Усё адзенне і абутак, якія яны прадставілі, было пашыта з улікам іх індывідуальнасці — так, каб дзеці адчувалі сябе і модна, і камфортна.**

— Праблема інваліднасці — гэта не толькі праблема саміх інвалідаў, — заявіў на прэс-канферэнцыі, арганізаванай Пасольствам Італіі ў Беларусі, **Рашэд Мустафа Сарвар, прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у нашай краіне**. — Гэта праблема грамадства, наша з вамі праблема. Сёння самы час пагаварыць пра яе.

Прадстаўнік ЮНІСЕФ звярнуў увагу на тое, што Італія славіцца сваёй культурай — у самым шырокім значэнні гэтага паняцця.

— Шмат гадоў назад яна стала адной з першых краін у Еўропе, чый урад пачаў працаваць з інвалідамі. Сёння Італія — прыклад для многіх краін свету, бо ў ёй людзі з асаблівасцямі маюць амаль усе магчымасці. І гэта паказчык культуры.

У паказе прынялі ўдзел 18 дзяцей і маладых людзей з асаблівасцямі псіхічнага і фізічнага развіцця. Адзенне і абутак, якія мадэлі дэманстравалі падчас паказу, яны змаглі пакінуць сабе.

Як адзначыў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Італіі ў Беларусі Стэфана Б'янкі**, нягледзячы на сусветны крызіс, попыт на адзенне і аксесуары пад маркай «Зроблена ў Італіі» застаецца вельмі высокім — у тым ліку і ў нашай краіне.

— Ужо на працягу многіх гадоў мы ўдзельнічаем у Беларускім тыдні моды, — звярнуў увагу ён. — Мода — гэта мазаіка, якая ўтрымлівае некалькі кампанентаў. Я вылучаю сярод іх, па-першае, навацыі, па-другое, якасць вытворчасці і, па-трэцяе, стыль — тое, што непадуладна часу. З Беларускім тыднем моды мы супрацоўнічаем у сферы першага сегмента — гэта навацыі і творчасць. Штогод мы запрашаем маладых італьянскіх стылістаў для таго, каб яны прэзентавалі свае калекцыі ў Мінску, каб завязвалі кантакты з беларускімі дызайнерамі, дзяліліся вопытам. Мы лічым, што такія адносіны ўзбагачаюць мадэльераў.

Паміж Беларускай палатай моды і Нацыянальнай італьянскай палатай моды наладжана супрацоўніцтва. Па словах дыпламата, можна казаць пра супрацоўніцтва не толькі гэтых інстытутаў, але і прадпрымальнікаў. Прынамсі, ініцыятыва «Мода Італія» — прыватная.

— Мы чакаем, што пасля пасяджэння Беларуска-італьянскай міжурадавай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве, якое адбылося ў Мінску на мінулым тыдні, такіх ініцыятыў, праектаў стане ў разы больш, — спадзяецца пасол Італіі.

Ён звярнуў увагу журналістаў і на тое, што тавары, прадстаўленыя на выставе «Мода Італія», адпавядаюць «самым высокім крытэрыям элегантнасці і вытанчанасці, характарызуюцца дыхтоўнасцю і ўнікальным, непаўторным стылем».

Падчас VI Міжнароднай выставы-кірмашу «Мода Італія» аўдыторыі прадстаўляюцца калекцыі адзення і аксесуараў сезона восень-зіма 2016—2017. Калекцыі належаць прэстыжным італьянскім брэндам, што імкнуцца пашырыць сваю прысутнасць на беларускім рынку.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*



■ Будзьце абачлівымі!

# АСЦЯРОЖНА: КАНФІСКАТ!

## Карэспандэнт «Звязды» паспрабавала высветліць, якія нечаканасці могуць адбыцца пры куплі канфіскаванага аўто

**Нонсэнс — інакш і не назавеш сітуацыю, у якую патрапіў жыхар Магілёва пры куплі канфіскаванага аўтамабіля. Набыў яго мужчына ў салоне рэалізатара Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці, куды паступае тавар ужо накіраваны рашэннем суда ў даход дзяржавы. Але па дарозе ў Крычаў — месца пражывання новага ўладальніка — аўтамабіль быў спынены транспартнай інспекцыяй і кіроўцу прад'явілены штраф у памеры 600 еўра — амаль паўцаны аўто. Тое, што доўг вісеў на былым гаспадару машыны, нікога не бянтэжыла. Каб пазбегнуць далейшых непрыемнасцяў, пакупнік заплаціў чужы штраф. Спадзяваўся, што пасля высвятлення абставін грошы яму вернуць. Але на яго запыт Мінтранс адказаў: штраф быў спагнаны... справядліва.**

«Звязда» паспрабавала разабрацца, як такое магло атрымацца і якіх яшчэ сюрпрызаў чакаць пры куплі патрыманых аўто. Тым больш што сітуацыя ў Магілёве — не выключэнне. Дагэтуль, як паведамілі ў транспартнай інспекцыі па Магілёўскай вобласці, такі ж выпадак адбыўся ў Брэсце, а ў Мінску нават не аднойчы.

— Трэба было перш за ўсё даведацца, ці ёсць за аўтамабілем даўгі перад дзяржавай, — лічыць **начальнік інспекцыі Валерый РУДЗЯНОК**. — Інфармацыяй павінен валодаць прадавец. Ён нясе адказнасць за тое, што прадае. З чаго ўсё, уласна, пачалося. Мы ўбачылі, што па беларускіх дарогах рухаецца машына з украінскімі нумарамі, на руках кіроўцы ўкраінскі тэхпашпарт. Праверылі па нарматыўных базах і ўбачылі, што за транспартным сродкам вісіць доўг. Таму і забралі машыну на штрафную стаянку. Калі б на аўтамабілі былі часовыя нумары, не было б ніякіх інцыдэнтаў. Затрыманы транспартны сродак мы можам вярнуць толькі ў двух выпадках: калі будзе праведзена аплата даўгоў або зняты парушэнні. Працэдура зняцця парушэнняў займае час. Аплату можна зрабіць адразу. Кіроўца заплаціў — і мы вярнулі машыну.

***— А чаму не ўзнікла пытанняў да таго, як аўто было рэалізаванае?***

— Мы ажыццяўляем кантроль за транспартнымі сродкамі на дарогах агульнага карыстання, — тлумачыць сурразмоўца. — Калі на машыне транзітныя нумары, нам да яе справы няма. А калі аўто на замежных нумарах і па базе даденых, якая прадстаўляецца адпаведнымі органамі, на ёй вісіць доўг, яно будзе затрымана. У выпадку, калі доўг не пагашаецца, гэтым аўто пачынаюць займацца зусім іншыя органы. Канфіскат павінен прадавацца «чыстым» ад даўгоў. Чаму атрымалася інакш — не наша кампетэнцыя. І наогул, на якой падставе грамадзяніну РБ быў выдадзены ўкраінскі нумар і тэхпашпарт? Гэта парушэнне заканадаўства.

Як высветлілася, нават калі б машыну не спыніла транспартная інспекцыя, цяжкасці з яе рэгістрацыяй усё роўна ўзніклі б.

— Пасля таго, як аўто канфіскаванае, судовы выканаўца павінен зняць яго з уліку і перадаць на рэалізацыю, — кажа **начальнік аддзялення па агітацыі і прапагандзе ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Яўген ЖЫЛІНСКІ**. — Бо калі новы ўладальнік звяртаецца ў ДАІ, каб паставіць машыну на ўлік, а доўг не пагашаны, аўто намінальна належыць былому ўладальніку.

Гандлёвы прадстаўнік ЗАТ «Белрэалізацыя», якому карэспандэнт «Звязды» патэлефанавала ў якасці ахвотнай купіць канфіскаваны аўтамабіль без «сюрпрызаў», запэўніў:

— Непаразуменні ўзнікаюць, калі ў прадаўца няма акта на рэалізацыю машыны. У гэтым выпадку ніхто не мае права прадаваць аўто і наогул на ім перамяшчацца. У нас з гэтым усё ў парадку. 80% аўтамабіляў, якія мы прадаём, належалі дзяржаўным арганізацыям і мелі запазычанасці перад банкамі. Усе яны канфіскаваны ў судовым парадку. І права на іх продаж, паўтаруся, пацвярджаецца актам на рэалізацыю. Ацэнку аўтамабіляў робіць Гандлёвая палата Магілёва або Мінска.

— Мы не займаемся прадажам «праблемных» машын, — дадаў прадстаўнік «Белрэалізацыі». — Гэта тыя, што былі прыгнаны ў Беларусь па «шостым» дэкрэце; канфіскаваныя за кіраванне ў нецвярозым стане; часова ўвезеныя і на продаж якіх павінен быць дазвол мытні.

Гандлёвы прадстаўнік расклаў па палічках, з чаго складаецца плата за аўто. Частка грошай ідзе на судовыя выдаткі і паслугі па рэалізацыі. Астатнія — на рахунак спагнанніка. І пакуль ён грошы не атрымаў, на машыне ляжыць арышт.

Машына, якую затрымала ў Магілёўскай вобласці транспартная інспекцыя, была арыштавана Гомельскай мытняй за парушэнні тэрмінаў часовага ўвозу і ў выніку канфіскавана.

— Пры парушэнні мытнага заканадаўства канфіскацыя адбываецца толькі праз суд (артыкул 14.7 Кодэкса аб адміністрацыйнай адказнасці), — тлумачыць **намеснік начальніка Магілёўскай мытні Людміла ШАВЯРДАК**. — Потым машына перадаецца ў камісію па рабоце з маёмасцю, якая створана Дэпартаментам па гуманітарнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь. Камісія вызначае гандлюючую арганізацыю, якая займаецца рэалізацыяй. У рашэнні суда заўсёды гаворыцца: канфіскаваць і перадаць у маёмасць дзяржавы, або спагнаць мытныя плацяжы за кошт арыштаванага транспартнага сродку. Пасля гэтага ўсякія абавязацельствы ў адносінах да такога транспарту для нас спыняюцца.

Дарэчы, магілёўскім мытнікам не аднойчы даводзілася прымаць меры па канфіскацыі транспартных сродкаў, якія ўвозіліся замежнікамі для часовага карыстання. На тэрмін да года чалавек вызваляецца ад неабходнасці плаціць мытныя падаткі. Але калі спатрэбіцца трымаць такое аўто на тэрыторыі Беларусі больш як паўгода, уладальнік павінен папярэдзіць мытнікаў. Інакш могуць узнікнуць непрыемнасці. І прыкладаў, калі іншаземцы ігнаруюць закон, хапае. Але кожнаму даецца шанц выправіцца: плаці мытныя плацяжы і забірай машыну. Сумы залежаць ад года выпуску транспартнага сродку, аб'ёму яго рухавіка і іншага. Сумы не маленькія, і некаторыя ахвяруюць машынай. Пасля гэтага за справу бярэцца суд.

У Дэпартаменце па гуманітарнай дзейнасці паведамілі, што канфлікт па сутнасці ўжо вычарпаны. «З 17 лютага дзейнічаюць змены ва Указ №349, якія ўносяць яснасць, — паведаміў па тэлефоне **намеснік дырэктара Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Дзмітрый ШАКУНОЎ**. — Канфіскаваныя аўтамабілі цяпер будуць прадавацца выключна з часовымі нумарнымі знакамі».

Вось толькі магілёўчаніну, якому прыйшлося заплаціць 600 еўра «за таго хлопца», не лягчэй. Дзмітрый Шакуноў кажа, што зараз Дэпартамент займаецца ўрэгуляваннем гэтага пытання з Мінтрансам. Хочацца верыць, што грошы новаму ўладальніку аўто вернуць.

**Калі новы ўладальнік звяртаецца ў ДАІ, каб паставіць машыну на ўлік, а доўг не пагашаны, аўто намінальна належыць былому ўладальніку.**

Між тым праблемы могуць узнікнуць не толькі пры куплі канфіскаваных аўто.

— Перад тым як набываць машыну, якая пабыла ў іншых руках, трэба ўсё сто разоў праверыць, — кажа Яўген Жылінскі. — І рабіць гэта рао праз ДАІ. Лепш за ўсё весці перамовы непасрэдна з уладальнікам машыны, якая выстаўлена на продаж. Калі на руках прадаўца копія пашпарта ўладальніка, празвішча якога ўказана ў тэхпашпарце аўто, ужо могуць быць пытанні. З таго моманту, як машыну нехта прадаў, скажам, у Брэсце, яна магла памяняць некалькіх уладальнікаў. Невядома які шлейф непрыемнасцяў за ёй цягнецца.

Быў у практыцы ДАІ і такі выпадак. Сужэнцы развяліся, і былая жонка паспяшалася прадаць машыну. Але, па рашэнні суда, аўто палічылі агульна нажытай маёмасцю. Давялося здзелку прызнаць несапраўднай і вяртаць усё на свае кругі.

Шмат падводных камянёў выяўляецца пры куплі машыны ў Расіі. Яўген Жылінскі расказвае пра машыны-двайнікі, калі чалавек спрабуе паставіць сваю набытую за мяжой пакупку на ўлік і высвятляе, што машына з такім жа нумарам кузава ў Беларусі ўжо ёсць. Каб застрахавацца ад такой сітуацыі, трэба пры куплі аўто ў Расіі адразу ж з прадаўцом звярнуцца ў тамтэйшую аўтаінспекцыю, каб не сумнявацца, што машына «чыстая». Калі прадавец адмаўляецца, варта ўстрымацца ад пакупкі.

— На жаль, у нас з Расіяй няма адзінай базы рэгістрацыі транспарту, — кажа Яўген Жылінскі. — Таму, каб праверыць машыну, трэба рабіць запыт. А гэта патрабуе часу.

**«Біяграфію» машын высвятляла Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ПРУП «ГРОДНОЭНЕРГОСБЕРЕЖЕНИЕ»

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор торгов** | Частное предприятие по антикризисному управлению «НисаБел» (230023, г. Гродно, ул. Телеграфная, 5-7, e-mail: nisabel@mail.ru, тел.: (029) 866 10 00, 80152 72 11 73) | | |
| **Продавец** | ПРУП «Гродноэнергосбережение» (230001, г. Гродно, проспект Космонавтов, 60В, управляющий (029) 8661000) | | |
| **Форма проведения торгов** | Первые повторные торги в форме аукциона | | |
| **Дата, время и место проведения торгов** | **22 марта 2016 года в 14.00 по адресу: 230003, г. Гродно, проспект Космонавтов, 60В** | | |
| **Сведения о предмете торгов** | **№ лота** | **Наименование имущества** | **Начальная цена в белорусских рублях (с учётом НДС)** |
| | **Лот № 1** | Автомобиль легковой «КИА MAGNETIS» | 76 840 200 |
| | **Лот № 2** | Газоанализатор «Тесто-335» в комплекте | 24 333 600 |
| | **Лот № 3** | Генератор EUROPOWER сварочный EP 200 X-HS200AD | 18 000 200 |
| | **Лот № 4** | Грузовой автомобиль «Фиат Дукато» | 57 734 100 |
| | **Лот № 5** | Механизм листогибочный И2222Б | 34 713 600 |
| | **Лот № 6** | Ножницы кривошипные листовые с поперечной резкой листа НА 3221 б/у | 44 286 000 |
| | **Лот № 7** | Ножницы листовые | 22 545 600 |
| | **Лот № 8** | Станок вертикально-фрезерный 6Р12 | 20 366 400 |
| | **Лот № 9** | Станок радиально-сверлильный 2М-55 | 24 156 000 |
| | **Лот № 10** | Тепловизор SAT S-280 | 23 240 400 |
| | **Лот № 11** | Установка компрессорная ВК-10-10-500Д | 31 231 200 |
| **Порядок проведения торгов** | Шаг аукциона составляет от 5% от начальной цены предмета аукциона. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает в себя НДС. Победитель аукциона (покупатель) и продавец подписывают договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем аукциона (покупателем) не позднее 30 дней со дня проведения аукциона. В случае признания аукциона несостоявшимся в связи с тем, что на участие в аукционе подано заявление только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет торгов продается единственному участнику, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (Пять) процентов.<br>Оплата вознаграждения и возмещение затрат за организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (покупателем) помимо оплаты стоимости предмета аукциона в течение трех рабочих дней со дня его проведения в соответствии с порядком проведения аукциона.<br>Организатор конкурса имеет право не позднее чем за 5 дней до его начала снять с конкурса предмет торгов и отказаться от его проведения | | |
| **Размер задатка для участия** | 5 000 000 белорусских рублей | | |
| **Сроки приема задатка и порядка зачисления задатка** | Заявки принимаются с 9.30 до 17.00 по факсу (80152) 71-41-29, 74-41-02 и (или) электронной почте nisabel@mail.ru до 21.03.2016. Задаток перечисляется на р/с № 3012140195051 в ОАО «БАНК БЕЛВЭБ», БИК 153001226, получатель – ПРУП «Гродноэнергосбережение», УНП 590004154 | | |
| **Документы, необходимые для участия в торгах** | Заявление на участие в торгах, платежный документ о перечислении задатка, документ, подтверждающий полномочия на участие в торгах. Документы предоставляются **в срок до 9.30 21.03.2016.** Сроком поступления заявления является дата регистрации в журнале регистрации | | |
| **Публикации извещений о проведении торгов по продаже имущества ПРУП «Гродноэнергосбережение»** | Первые торги 10 июня 2015 г. газета «Звязда» от 5 мая 2015 года № 82 (27940) | | |



**Извещение о проведении первых и повторных открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность**
**Организатор аукционов: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62**

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым номером 224485318601000163, площадью 0,2500 га по адресу: Витебская обл., Сенненский р-н, Ходцевский с/с, аг. Ходцы для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранные зоны линий связи и радиофикации, линий электропередачи до 1000 В. **Начальная цена**: 10 000 000 бел. руб. **Размер задатка:** 1 000 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 05.04.2016 в 15.00 по адресу: г. Сенно, ул. К. Маркса, 2 в Сенненском райисполкоме. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 05.03.2016 с 8.30 по 04.04.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. Условия аукциона: получить техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем. участка не позднее 1 года после получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации права на него. Реквизиты для внесения задатка: р/с 3641326098006 в ЦБУ №218 г. Сенно, ф-л № 200, Витебское обл. управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300027291, код платежа 04901, получатель платежа Ходцевский сельисполком |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №220882719601000033, площадью 0,2499 га по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Друевский с/с, д. Почта Абабье для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона особо охраняемых природных территорий (ГПУ «Национальный парк «Браславские озера»); водоохранная зона водного объекта (озеро Обабье). **Начальная цена**: 15 000 000 бел. руб. **Размер задатка:** 1 500 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 25.03.2016 в 12.00 по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 05.03.2015 с 8.30 по 24.03.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Условия аукциона:** разработать и утвердить ПСД на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; произвести занятие (освоение) зем. участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство жилого дома. Извещение опубликовано в газете «Звязда» от 04.11.2015. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600312040003 ЦБУ №205 г. Браслав, ф-л №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк, код 150801660, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №221285904101000222, площадью 0,0921 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Дреколье, ул. Центральная для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Дрекольское). **Начальная цена:** 16 455 060 бел. руб. **Размер задатка:** 1 645 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 07.04.2016 в 16.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 05.03.2016 с 8.30 по 06.04.2016 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни. **Условия аукциона:** получить техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома, приступить к занятию зем. участка в течение 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство капитального строения. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600314090174 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа – Мазоловский сельисполком |

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД, осуществить строительство с сроки, определенные ПСД. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Конт. тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

Паўднёвы Усход
Сумесны праект газеты «Звязда» і Магілёўскага аблвыканкама

# ЧЭРЫКАЎ ПЕРАХОДЗІЦЬ НА АЛЬТЭРНАТЫЎНУЮ ЭНЕРГЕТЫКУ

**Чэрыкаўскі раён займае плошчу больш за 100 тысяч гектараў, амаль на 60 працэнтаў пакрыты лясамі. На яго тэрыторыі праходзяць дзве буйныя транспартныя магістралі — Р43 (Івацэвічы — Крычаў — мяжа РФ) і Р122 (Магілёў — Касцюковічы). Сёння ў раёне пражывае каля 15 тысяч чалавек, звыш 8 тысяч з іх непасрэдна ў Чэрыкаве. Пад рэалізацыю праектаў у раёне вылучылі 14 перспектыўных інвестыцыйных пляцовак. Тут вельмі зацікаўлены ў стварэнні аб'ектаў сельскагаспадарчай або прамысловай вытворчасці.**



Старшыня Чэрыкаўскага райвыканкама Аляксандр МУРАЎЁЎ запрашае ствараць бізнес.

## Бізнес на вокнах

Уладзімір Фёдараў, дырэктар Чэрыкаўскага жылкамунгаса, настроены аптымістычна. Прадпрыемства атрымала магчымасць скарыстацца прывілеямі праграмы развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна і асвоіла новы від дзейнасці. Тут распачата рэалізацыя праекта па вытворчасці вокнаў з профілю ПВХ. Летась прадпрыемства ўклала ў рэалізацыю праекта 450 мільёнаў рублёў — зрабіла рамонт памяшкання, набыло неабходнае абсталяванне. І прыплічае атрымаць дадатковую суму ў выглядзе льготнага крэдыту, каб сёлета завяршыць рэалізацыю праекта.

— За чацвёрты квартал мы зрабілі больш за 130 вокнаў і некалькі дзясяткаў дзвярэй на суму амаль 660 мільёнаў рублёў, — расказвае дырэктар пра магчымасці новага цэха. — Усе яны былі запатрабаваныя на будаўніцтве і пры капітальным рамонце дамоў. Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі па мінулым годзе склала больш за 10 працэнтаў. Для прадпрыемства гэта сур'ёзны паказчык.

А можна і без яе абысціся, калі месцы ведаць. Вось **спадарыня Святлана Мазанік з вёскі Масцішча Барысаўскага раёна** лічыць, што мужчына са здымка кажа:

*Не палохае разводдзе —*
*Я іду да свата.*
*Адна думачка малодзіц:*
*Вып'ем не гарбаты!*
*Сват не жмінда —*
*Вып'ем многа,*
*Спаць я не звалюся...*
*У боты... рукі, у боты ногі,*
*І дамоў вярнуся.*

Ёсць, на вялікі жаль, такія «пешаходы». Балюча глядзець на іх, бо яно ж і сапраўды (прабачце!): стане хтосць ракам, і ўсё — ад чалавека амаль нічога...

Але тут і цяпер разважаць пра гэта не будзем. Тут і цяпер «з падачы» **спадарыні Бажок** іншая тэма прасіцца — пад назвай

*«Рыбакі лавілі рыбу»...*
*А спаймалі — боты,*
*Цэлы дзень маракавалі:*
*«Дык чыёй работы?»*

Ёсць думка у **спадара Міколы Кіселя з Мінска,** што нашай, айчыннай. Новыя тэхналогіі на вытворчасці прымяняюцца, прычым самыя нечаканыя:

*Рэчка выйшла з берагоў,*
*Падышла да плота.*
*І штодня цяпер... улоў:*
*Рыба... лезе ў боты!*

Сама... Лавіць не трэба! На нейкі новы пах «бярэцца» ці што?

Пытанне хіба, як доўга пратрымаецца, узяўшыся...

Праўдзівая гісторыя: наш чытач расказаў. Яго жонка неяк карпаў накупляла, укінула ў ванну: гаспадар, маўляў, вечарам прыйдзе і пачысціць... З гэтай думачкай спаць лягла. А муж трохі загуляў, вярнуўся позна, мякка кажучы, нецвярозы. Убачыў, што ў ванне штось цёмнае плавае, — падумаў, што жонка адзежу замачыла, раніцай будзе мыць. Ну дык ён, каб парашок сэканоміць, і свае шкарпэткі туды... Потым толькі заснуў — вэрхал у хаце! Жонка лютуе: дагары жыватамі ўсе карпы плаваюць! Адсюль — новы спосаб забойства: шкарпэткамі.

А без іх жа і ў ботах ніяк... Хоць, зрэшты, мае рацыю **спадар Гарачоў:**

*Не вялікая бяда,*
*Што на вуліцы вада,*
*Што парваўся новы бот, —*
*Абы ў хаце без грызот!*

Што праўда, тое праўда! І хай Бог дае...

Вось на гэтай ноце і завяршыць бы чарговы агляд, але ж трэба паведаміць «хто каго» — перамог, перасягнуў у жартах — на папярэднім этапе. На думку вялікага чытацкага журы, найлепшыя подпісы пад здымак з сабакам сярод вайскоўцаў (гл. «Звязда» 6 лютага г.г.) прапанавалі **спадарыня Валянціна Пабягайла з Ляхавіч, Валянціна Гудачкова з Жыткавіч, Раіса Васільева з Гомеля, члены гуртка «Спроба пяра» з Вілейкі, спадары Стасілевіч з Мінска, Гарачоў з Іўеўшчыны, і Валерый Гаўрыш з Чавусаў.**

Вось з гэтым, апошнім, меркаваннем не магло не пагадзіцца і журы маленькае — рэдакцыйнае (яшчэ і таму, што — спадар Старых палічыў — цягам двух апошніх гадоў вершы спадара Валерыя былі не проста змешчаны пад усімі 15 здымкамі, але і сем разоў прызнаваліся найлепшымі!)...

Такім чынам, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на другі квартал бягучага года накіроўваецца ў горад Чавусы. Хочаце, каб да вас? Нічога супраць не маем: уважліва глядзіце на новы (ніжні) здымак, думайце і пішыце — коратка (не больш за восем радкоў), дасціпна, па-беларуску...

**Валянціна ДОЎНАР.**
*dounar@zviazda.by*

***P.S.*** Калі матэрыял быў падрыхтаваны да друку, пошта прынесла яшчэ адзін ліст — ад сужэнцаў Астроўскіх з Мінска. Адтуль кароткае:

*Людзі простыя заўжды*
*Трапна прыкмячаюць:*
*Як вясною шмат вады,*
*Гэта — к ураджаю!*

І яшчэ:

*Шмат бядот цяпер на свеце:*
*То вада, то снег, то вецер.*
*Толькі дробязь гэта ўсё,*
*Бо важней за ўсё — жыццё!*

Дык вам — выключна шчаслівага, з уражаямі... Са святам! Пішыце!





Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 8 (308)



■ Вернісаж

# ЖАНОЧЫ ГУСТ ЯК АБСАЛЮТ

**І цуд, і нонсэнс, і першы вопыт. Выдавецтва «Бяловагруп» у «Галерэі Мастацтва» прадставіла ўнікальны альбом жывапісу — выключна жаночага. Таму назва «Высокі густ» гучыць як прыемны камплімент быццам прыродным якасцям асоб жаночага полу. Маўляў, тонкі густ, неад'емны і бездакорны, — гэта ўсё ваша (не выключэнне, а правіла). На старонках свежага выдання аказаліся работы 27 мастачак розных пакаленняў і творчых кірункаў.**

Наталля Іванова і Ганна Сілівончык, Вольга Шкаруба і Вікторыя Ільіна (пра якую мы не так даўно пісалі), Тацццяна Грыневіч і Жанна Капуснікава... 27 імёнаў, прадстаўленых у альбоме, — гэта, вядома ж, не ўсё, што можна было змясціць пад вокладкай, але дастаткова, каб, па словах доктара мастацтвазнаўства і прафесара Вольгі Бажэнавай, «узняць беларускае мастацтва і яго асэнсаванне на новую ступень».

«Высокі густ» — першае выданне падобнага кшталту. Сімвалічна, што прэзентуецца яно напярэдадні міжнароднага жаночага дня, што дырэктарам выдавецтва з'яўляецца Тацццяна Бялова, а дырэктарка галерэі, у якой паралельна адкрылася выстаўка прадстаўленых у альбоме аўтарак, — Алена Лагоўская. Вакол жанчыны, шчыльна звязаныя са сферай мастацтва, сёння гэта не толькі музы, але і актыўныя пераўтваральніцы прасторы.

Аўтарам уступнага артыкула для альбома «Высокі густ», у якім закранута ўсе 27 імёнаў, стала таксама жанчына — мастацтвазнаўца і дырэктар Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Наталля Шаранговіч. І ўступнае прывітальное слова прагучала ад жанчыны — міністра інфармацыі Беларусі Ліліі Ананіч.

Усе тэксты ў кнізе прадстаўлены на рускай і англійскай мове, што робіць альбом выдатным падарункам для замежных сяброў. Дарэчы, некаторыя з іх наведалі прэзентацыю і адкрыццё выстаўкі, каб аднымі з першых убачыць новае выданне — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія Петэр Дэтмар, першы саветнік Пасольства Рэспублікі Сербія Ніра Егдзіч, трэці сакратар Пасольства Рэспублікі Таджыкістан Шохін Самадзі.

«Раней у нас не выдавалася кніг, у якіх акцэнтавалася б увага на жанчынах-мастачках, — кажа Вольга Бажэнава. — Прыкладна шаснаццаць гадоў таму мяне папрасілі назваць беларускіх мастачак XVI—XVIII стагоддзяў. Я разгубілася, бо не магла ўспомніць ніводнага імя, я спрабавала параіцца з беларускімі даследчыкамі, але ў адказ было маўчанне. Да XX стагоддзя жанчына-мастачка, тым больш вядомая, — гэта нонсэнс. І гэта не дзіўна — памятаеце, Адаму наканавана зарабляць, а Еве нараджаць. Калі я глядзела біяграфіі роду Радзівілаў, заўважыла, што ў жанчын указваецца дата не нараджэння, а замужжа. У гісторыі тых часоў яна магла быць прадстаўлена не як творца, а як святая, каралева, і, вядома, як муза. Шаснаццаць гадоў таму я змагла назваць толькі сем імёнаў, за гэты час даследчыкі дадалі яшчэ тры. «Высокі густ» прадстаўляе княгінь, каралеў беларускага жывапісу. Жанчыны размаўляюць па-іншаму і часта пра тое, што да гэтых часоў не пачута да канца».

У альбом увайшло каля 140 работ, ён з'яўляецца не толькі «дэкаратыўным» выданнем, але і паўнавартасным даследаваннем беларускага творчага працэсу.

Выстаўка работ жанчын-мастачак у «Галерэі Мастацтва» працуе да 14 сакавіка.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■ Прэзентацыя

# ЭПОХА БАКСТА

## Уладзімір Шчасны прадставіў сваю новую кнігу «Леў Бакст: Жыццё пяром Жар-птушкі»

**Прэзентацыя кнігі, што пабачыла свет у выдавецтве «Чатыры чвэрці» пры падтрымцы «Белгазпрамбанка», прайшла ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. Менавіта тут цяпер месціцца выстаўка «Час і творчасць Льва Бакста», арганізаваная пры фінансавай падтрымцы, дарэчы, таксама «Белгазпрамбанка». Але пройдзе час, экспазіцыю дэмантуюць, арыгіналы работ Бакста і яго паплечнікаў схаваюцца ў фонды музеяў і банкаў, а кніга застанецца...**




Кніга-эсэ, прысвечаная жыццю і творчасці мастака, які нарадзіўся ў Гродне, але пакарыў Парыж, стаў сімвалам Прыгожай эпохі, быў выдатным жывапісцам, графікам, сцэнографам, мадэльерам і нават літаратарам. Гэта не мастацтвазнаўчы аналіз творчага шляху нашага славутага земляка, не падборка сухіх фактаў, а цёплы расповед, разважанні, роздумы. Адметна, што менавіта Уладзімір Шчасны, перакладчык, дыпламат, а сёння арт-кансультант «Белгазпрамбанка», быў адным з ініцыятараў правядзення выстаўкі работ Бакста і паплечнікаў у Мінску.

— Амаль два гады таму пачалася праца па арганізацыі экспазіцыі, столькі ж доўжылася і работа над кнігай. Паступова назапашваўся цікавы матэрыял, а паколькі ніводнай папулярнай кнігі пра Бакста дагэтуль не было (ёсць толькі мастацтвазнаўчыя работы, прызначаныя для спецыялістаў), вырашыў афарміць вынікі сваіх пошукаў у кнігу эсэ, — распавёў Уладзімір Рыгоравіч.

На думку аўтара, менавіта эсэ можна лічыць найлепшым жанрам для расповеду пра выдатныя постаці: яны заснаваны на пэўных фактах, але і пісьменнік выказвае сваю думку, стаўленне, пры гэтым не прэтэндуе на паўнату, вычарпальнасць апавядання. Крыніцы стараўся адшукаць у архівах: Нацыянальным гістарычным архіве ў Мінску і ў Гродне, бібліятэках. Шмат цікавых звестак пра Бакста змяшчае двухтомнік яго ўспамінаў і лістоў «Мая душа адкрыта», што выйшаў некалькі гадоў таму ў Маскве. Карыстаўся французскім часопісам Comoedia Illustre, нумарамі часопіса «Мир искусства», дзе некаторы час працаваў сам Бакст. Дарэчы, гэтыя выданні захоўваюцца ў нашай Нацыянальнай бібліятэцы. Чытаў шмат успамінаў пра Бакста, якія пакінулі яго сучаснікі, — Бенуа, Дабужынскі, Сомаў. Уладзімір Шчасны лічыць, што ў гэтым выпадку мемуары нават больш каштоўныя для даследчыка, чым некаторыя дакументы.

Той час, у які жыў і працаваў Леў Бакст (канец XIX — пачатак XX ст.), можна назваць эпохай мастакоў-універсалаў. Яны ў адной асобе спалучалі мноства талентаў, былі жывапісцамі, графікамі, сцэнографамі, мастацтвазнаўцамі, літаратарамі, удзельнічалі ў напісанні лібрэта да балетаў і опер, над сцэнічным увасабленнем якіх працавалі, пакінулі выдатныя ўспаміны і нават літаратурна-мастацкія творы. Дарэчы, і сам Леў Бакст выдаў некалькі кніг.

— У 1924 годзе ён напісаў выдатны аўтабіяграфічны раман «Першае жорсткае каханне», не так даўно ён быў апублікаваны у Маскве, — зазначае Уладзімір Шчасны. — Гэтая кніга расказвае пра юнацтва Бакста і яго трагічны раман з французскай актрысай Марсель Жасэ. Бакст вельмі цікава апісвае атмасферу Пецярбурга канца XIX ст. Цікава, што для стварэння вобразу свайго героя ён карыстаецца ўласным імем і прозвішчам, імёны ж усіх астатніх персанажаў, якія мелі рэальных прататыпаў, хавае за псеўданімамі. Бакст напісаў і нарыс пра паездку з Сяровым у Грэцыю, ён апублікаваны ў Берліне ў 1923 годзе.

Сямейныя таямніцы і творчыя клопаты, жыццё пецярбургскай, парыжскай творчай багемы і выданне часопіса «Мир Искусства», мноства фотаздымкаў, эскізаў, рэпрадукцый работ... За кнігай «Леў Бакст: Жыццё пяром Жар-птушкі» чытач прыемна прабавіць не адну гадзіну. Як кажа сам Уладзімір Шчасны, цікавасць публікі, яе жаданне знаёміцца з кнігай і будзе найлепшай пахвалой. Ён распавядае:

— Калі пабачыла свет мая першая кніга «Мастакі Парыжскай школы з Беларусі», неяк мне патэлефанаваў прафесар Адам Мальдзіс і сказаў: я пачаў кнігу чытаць увечары і скончыў раніцай. Спадзяюся, што гэтую работу таксама чакае добры лёс, што чытач не засне на пятай старонцы і прачытае калі не за адзін раз, то да канца.

Сёння Уладзімір Шчасны, крыху стомлены Бакстам, распрацоўвае канцэпцыі новых выставачных праектаў. Спадзяёмся, яны гэтак жа моцна захопяць аўтара, і аматары мастацтва атрымаюць некалькі новых цікавых кніг.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

■ Прэм'ера

# НЕПРЫХАВАНАЯ ЛЁГКАСЦЬ ПАЧУЦЦЯ

## «Маленькая смерць» падчас кахання: мастацкая паэтызацыя ў балеце

**Гэта была эпоха Моцарта, калі за сэрцы цудоўных дам кавалеры былі гатовыя змагацца на рапірах. І, атрымаўшы жаданае, закаханыя адкідвалі ўсе прыкметы часу: пампезныя сукенкі, напудраныя парыкі і ўсю іншую зброю, акрамя пачуцця. І ў самыя шчырыя моманты даверу людзі заставаліся сам-насам, іх упрыгожаннем было каханне, якое галізну і адкрытасць ахінала покрывам цнатлівасці. Як і ў любую эпоху. Людзі часоў Моцарта мала чым адрозніваюцца ад нашых сучаснікаў, калі перажываюць сваю «маленькую смерць» — момант найвышэйшага фізіялагічнага і псіхічнага наталення ў каханні.**

Усё гэта на сцэне. У Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі прэм'ера балета «Маленькая смерць» харэографа Іржы Кіліяна, чэха па паходжанні, які напрыканцы мінулага стагоддзя змяніў сусветны балет сваімі гучнымі пастаноўкамі ў Нідэрландскім тэатры танца. І працягвае гэта рабіць цяпер. Але ранейшыя яго пастаноўкі ў аўтарскай харэаграфіі запатрабаваныя і прыходзяць у іншыя тэатры свету.

Некалькі гадоў таму ў Мінску быў пастаўлены балет «Шэсць танцаў» (харэаграфія Кіліяна на музыку Моцарта), які змяніў рэпертуарную палітру нашага тэатра, дзе рэй вяла класіка. Але сам аўтар настойваў на тым, што два яго балеты на музыку Моцарта павінны ісці ў адзін вечар. Гэта лагічна: у «Шасці танцах» вы сочыце за жартамі, якія могуць нараджацца ў пераглядзе стаўлення да класікі. Гэта хутчэй заяўка на тое, што балет можа мяняцца ў залежнасці ад часу. «Маленькая смерць» — гэта ўжо трыумф сучаснай харэаграфіі, нават калі глебу да яе стварэння дае ўсё тая ж класічная музыка.

Як і папярэднюю пастаноўку, прэм'еру «Маленькай смерці» ў Беларусі рыхтавалі пад наглядам спецыялістаў з Галандыі. Асістэнт харэографа — Шырлі Эсэбум. Аўтар касцюмаў Ёуке Вісер — і яны захаваныя, як у арыгінале, таму што без іх не прагучала б сама ідэя пастаноўкі. На артыстах амаль нічога няма (так здаецца), толькі бялізна колеру скуры. Але ніякай пошласці. Цела — гэта і ёсць вопратка, у якой хаваюцца жывыя эмоцыі. Ёсць толькі яны, і нічога навокал — гэта падкрэслена абсалютным мінімалізмам у афармленні спектакля, дзе інтымны характар адносін шасці пар перадае нават асвятленне, што таксама было закладзена галандскай групай. Менавіта таму, што ўся ўвага ў гэтым балеце на выканаўцах сольных партый — складаных і нязручных, а магчыма, і незразумелых у кантэксце класічнай падрыхтоўкі. Гэта здаецца, што ўсё лёгка і ўмоўна: артыстам трэба не проста танцаваць ці механічна выконваць рухі (часам падобныя да акрабатыкі), ім трэба паказаць «маленькую смерць», каб твор, які разгортваецца на працягу якіх 20 хвілін (прыкладна як акт кахання), выглядаў часткай жыцця. Ім трэба, магчыма, адчуць сваю найвышэйшую асалоду — ад творчага экстазу, што маеш дачыненне да дзіўнай пастаноўкі, дзе кожная партыя патрабуе віртуознасці. Балеты Іржы Кіліяна прыходзяць у тыя тэатры, дзе ёсць каму іх танцаваць. У нас 2 склады салістаў расказваюць гісторыі адносін мужчыны і жанчыны, якія раствараюцца адзін у адным. Задума аўтара. Задума тэатра: веліч кахання на пачатку вясны.


Фота Марыі ВОЙЦІК.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

■ Кінакрокі

# Калі жаданні не супадаюць з вынікам

## Пагоні, выбухі і аварыі ў сапраўдным айчынным баевіку



**Цыкл фільмаў «Дзяржаўная граніца» быў распачаты яшчэ ў савецкія часы: у першай карціне гаворка ішла пра маладую савецкую рэспубліку 1917 года. Потым былі барацьба з контррэвалюцыйнымі сіламі, Сярэдняя Азія ў 1930-я гады, пасляваенны час, шпіёны заходніх разведслужбаў у 1960-я і гэтак далей. Апошняя карціна серыі, нядаўна прадстаўленая «Беларусьфільмам» і Дзяржаўным пагранічным камітэтам, апавядае ўжо пра сучаснасць, прычым самую канкрэтную — падзеі фільма «Дзяржаўная граніца: ілжывая мэта» разгортваюцца падчас чэмпіянату свету па хакеі, што праходзіў у Мінску.**

Стужка пачынаецца з інтрыгі. Таямнічыя і даволі грозныя асобы выкрадаюць баязлівага дзялка Цюрына, для ўражання забіваюць, здаецца, яго памочніка і вельмі настойліва патрабуюць забяспечыць незаконны пераход праз мяжу. Безыменная пабудова, безыменныя людзі, безыменная мяжа — ідэальная завязка для баевіка. Карціна з тлустым акцэнтам на галоўным героі (героі ва ўсіх сэнсах гэтага слова), што важна, не знята ў жанры экшэн, а зроблена ў яго форме.

Стваральнікі пайшлі па пракладзеных дарожках галівудскіх баевікоў і распрацавалі на гатовы шаблон насадзіць быццам рэальную гісторыю з практыкі беларускай пагранічнай службы. Нягледзячы на тое, што геаграфічныя нюансы ў фільме апушчаны, доля праўды, кажуць, у карціне ёсць. «Можна сказаць, што фільм заснаваны на рэальных падзеях, — пракаментаваў намеснік старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Уладзімір Маісеенка. — Але, вядома, з пэўнымі зменамі. Усю нашу працу, як вы разумееце, з-за сваёй спецыфікі паказваць нельга».

Форма класічнага экшэна, на які раўняліся стваральнікі «Дзяржаўнай граніцы», прадугледжвае моцнага цэнтральнага персанажа. На гэты раз замест цяжкавагавага «Тэрмінатара» (Арнольд Шварцэнэгер), непераможнага спецагента Ітана Ханта (Том Круз) з «Місія невыканальная», пазасістэмнага віртуознага вадзіцеля з «Перавозчыка», замест Бруса Уіліса, Жан-Клода Ван Дама, Чака Норыса — бездакорна прафесійны і бясконца патрыятычны маёр пагранічнай службы Канстанцін Кудзін у выкананні Дзмітрыя Ратамскага.

Глядач бачыць яго ў ідылічным эпізодзе адразу пасля размовы Цюрына з небяспечнымі таварышамі, а такі кантраст на пачатку фільма — чарговы штамп. Кудзін іграе з сынам у танчыкі — адна з нямногіх адсылак да нашай сучаснасці з апеляваннем да вядомай анлайн-гульні World of Tanks, створанай у Беларусі.

Галоўны герой працуе на заставе, дзе некалі памёр яго бацька, менавіта таму ён адмаўляецца ад павышэння па службовай лесвіцы і «месца» ў вялікім горадзе, а толькі прафесійна і самааддана выконвае свае абавязкі. У гэты час яго найлепшы сябар робіць ваенную кар'еру, а жонка Кудзіна здраджвае маёру з тым самым сябрам.

Здаецца, галоўнае памкненне фільма — стварыць вобраз героя нашага часу. Прынцыповы і патрыятычны Канстанцін Кудзін гатовы аддаць жыццё за сваю заставу. «Трэба будзе — здохну», — цвёрда кажа ён у адказ на кпіну жонкі. Пакуль глядач назірае за дэманстрацыяй выключнасці галоўнага героя, за выкрыццём жончынай здрады, за кіданнем ад станоўчых герояў да адмоўных, маёра ставяць ва ўмовы, у якіх ён аказваецца здольным ахвяраваць сваім грамадзянскім абавязкам. Дзеля сям'і, якую выкралі зламыснікі, і, трымаючы яе ў клетцы, шантажуюць Кудзіна. Каб вызваліць сваю сям'ю (а жонцы герой нашага часу па-вайсковаму цвёрда даравай здраду), маёр павінен пранесці на сабе бомбу на адзін з матчаў чэмпіянату свету па хакеі. І падарваць сябе.

Што з гэтага заснавана на рэальных падзеях?..

Я цаню інтрыгу і дынамізм экшэнфільмаў, дапускаю, што такія сюжэты здараюцца ў рэальным жыцці, «лайкаю» імпэт стварыць беларускія баевікі — але я супраць таго, каб накладаць беларускі матэрыял на чужародную глебу, працаваць па шаблоне, выкарыстоўваць форму, у якой яшчэ да нас створаны неабвержна лепшыя прыклады класічнага баевіка. «Дзяржаўная граніца: Ілжывая мэта» да фільмаў, наследаванням якім служыць, не дацягвае ні па саспенсе, ні па дынаміцы, ні па інтрызе ў вызначэнні ворагаў і сяброў. А спроба стварыць гераічны вобраз супрацоўніка пагранічнай службы — Канстанціна Кудзіна — не ўдалася з прычыны бясконцага пафасу.

Завязка сюжэта, палярнае размежаванне герояў на станоўчых і адмоўных, пагоні і выбухі, смерць і «ўвасакрашэнне», уздзеянне на галоўнага героя варожых сіл, дапамога «адкуль не чакалі», пакаранне злачынца — усё гэта выглядае натужлівым і ненатуральным, таму большасць прадугледжаных эмоцый для гледача аказалася страчанай. Фільм, на жаль, не адпавядае выбранай форме, якая патрабуе пэўных уменняў і вядомай долі нахабства.

> **«Дзяржаўная граніца: Ілжывая мэта» да фільмаў, наследаваннем якім служыць, не дацягвае ні па саспенсе, ні па дынаміцы, ні па інтрыге ў вызначэнні ворагаў і сяброў. А спроба стварыць гераічны вобраз супрацоўніка пагранічнай службы — Канстанціна Кудзіна — не ўдалася з-за бясконцага пафасу.**

Нацягваць ідэю на шаблон, пасычаць гатовыя формулы — заганная практыка. Але і з гатовай формай стваральнікі не здолелі зрабіць фільм выразным, паставіць акцэнты на патрэбных момантах, не справіліся з дазіроўкай пафасу.

Можна было б не праяўляць прыдзірлівасць і зрабіць скідку гэтай карціне са словамі «для сваёй нішы нядрэнна». Толькі, як вядома, удзельнікі конкурсу кінапраектаў ацэньваюцца «па гамбургскім рахунку», таму глядач мае права чакаць ад беларускіх фільмаў, што паказваюцца ў кінатэатрах, высокай якасці і прафесіяналізму іх стваральнікаў.

Са сцэны Дома кіно падчас прэм'еры «Дзяржаўнай граніцы» было сказана, што гэты цыкл фільмаў будзе працягнуты. А значыць, аднаго з пераможцаў будучых конкурсаў кінапраектаў можна адгадаць ужо сёння.

Фільм «Дзяржаўная граніца: ілжывая мэта» ўваходзіць у лік пераможцаў аднаго з двух рэспубліканскіх конкурсаў кінапраектаў 2015 года. Паступова вынікі леташніх рашэнняў па дзяржаўным фінансаванні кінавытворчасці падбіраюцца адзін да аднаго. Конкурсы мінулага года вызначылі ў сукупнасці адзінаццаць пераможцаў, і мы ўжо змаглі ацаніць амаль усю дакументальную частку гэтага пласта — фільмы «Педагагічная паэма» Віктара Аслюка пра двух маладых настаўнікаў у правінцыі, «Беларусь. Дакументальная гісторыя» Галіны Адамовіч, «Трасцянец. Мы павінны ім памяць» Юрыя Гарулёва. На тэлеэкране не так даўно быў паказаны фільм «Мы, беларусы — мірныя людзі» Андрэя Лескіна пра Мінск у якасці пляцоўкі для пераможцы «нармандскай чацвёркі».

З ігравой часткі пераможцаў карціна «Дзяржаўныя граніца: ілжывая мэта» на вялікі экран выйшла першай (ужо прайшла ў пракаце). І пакуль толькі на шляху да гледача знаходзяцца фільм «Сляды на вадзе», частка цыкла «Участак лейтэнанта Качуры» і, вядома ж, больш працаёмкія серыялы «Трымайся за аблокі» нацыянальнай кінастудыі і «Аўташкола» ААТ «Сінетэхна».

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

■ Легенды і міфы

# АД СКАНДЫНАЎСКАЙ БАЛАДЫ ДА БЕЛАРУСКАГА ФЭНТЭЗІ

## Нацыянальны кінематограф засвойвае новыя жанры

**Легенды, паданні і міфалагічныя персанажы нашага краю часта ставіліся натхненнем для беларускіх аўтараў. Адзін толькі «Шляхціц Завальня» Яна Баршчэўскага чаго варты, улічваючы, што сам твор з'явіўся яшчэ да таго, як у сусветнай літаратуры сфарміраваўся жанр фэнтэзі. Праўда, кінематограф, апроч экранізацыі таго ж «Шляхціца Завальні», у выкарыстанні фантастычных матываў адышоў недалёка. Хіба што згадаць некаторыя работы Андрэя Кудзіненкі («Масакра»; пад яго кураторствам створаны праект «Хранатоп») ды дзіцячыя фільмы.**

Цалкам верагодна, што ў найбліжэйшы час гэты прабел можа быць запоўнены. Маладая мінская кампанія Aurios Studios сабрала прафесіяналаў кіно, літаратуры і музыкі для стварэння новага праекта — поўнаметражнага фэнтэзійнага фільма «Неруш», заснаванага на беларускіх легендах і міфах. Назву можна патлумачыць як «некранутае, дзікае месца», што адлюстроўвае ўласна ідэю фільма — пазнанне жыцця праз нязведанае і страшнае.

За напісанне арыгінальнага сцэнарыя (хоць спачатку планавалася экранізаваць Уладзіміра Караткевіча) узялася літаратарка і перакладчыца Юлія Шадзько. Для «Неруша» паводле беларускіх паданняў будуць перапрацаваны вобразы, пазычаныя са скандынаўскай балады «Herr Mannelig», якую аўтарыі раней ужо даводзілася перакладаць і «абеларушваць» для камернага хору — атрымаецца гэтакі працяг балады, але ўжо з беларускім нацыянальным каларытам. Дзяніс Жыгуноў, які здымаў кліп на песню «Салютарыса», сёння выступае рэжысёрам фільма. Прадзюсар і кампазітар Павел Герасімовіч выконвае функцыі кіраўніка, а таксама гукарэжысёра і аўтара саўндтрэка. Камерны хор «Салютарыс» дапаможа стварыць у фільме таямнічую атмасферу.

Паводле сюжэту рыцар уступае ў саюз з чароўнаю істотаю, але невядома, наколькі шчаслівы і доўгі. Пра гэта распавядае трэці герой, што трапляе ў лес Неруш недзе ў беларускай глухамані і пачынае разбірацца ў яго таямніцах. Вакол гэтага месца множацца незразумелыя і страшныя паданні, але, нягледзячы на гэта, яно застаецца надзвычай прывабным. Героя, які адважыўся ўвайсці ў гэты чароўны лес, чакае альбо забыццё, альбо вечная слава ў народных песнях ды легендах. Падзеі фільма будуць адбывацца ў нашым свеце, але ў той асаблівай прасторы, дзе звычайныя падзеі становяцца незвычайнымі, якая перайначвае людзей, паказвае іх з іншага боку.

Стваральнікі фэнтэзійнай стужкі акцэнтуюць увагу на тым, што сюжэт фільма будзе цалкам арыгінальны, а з паданняў возьмуць толькі вобразы. У карціне глядач убачыць папараць-кветку, балотнікаў і русалак, рыцараў і аналаг славутага нясвіжскага прывіду — Чорнай Панны. Здымкі фільма будуць праходзіць на натуры — на руінах старажытных замкаў і будынкаў, закінутых мясцінах, у змрочных лясах.

Скончаны і ўжо прадстаўлены публіцы трэйлер. Яго здымалі ў Друі, што на Віцебшчыне, у лясах блізу Ратамкі. Цяпер ідзе падрыхтоўка да здымак самога фільма — лакацыямі стануць таксама раён Узды, Блакітныя азёры і іншыя прыгожыя беларускія мясціны.

Грошы на фільм кампанія Aurios Studios збірае на краўдфандынгавай пляцоўцы Talaka.by — любы ахвотны можа стаць кінамецэнатам і дапамагчы праекту. На рэалізацыю планаў патрабуецца каля 220 мільёнаў рублёў, гэта прыблізна 10 тысяч долараў, пазней на постпрадакшн трэба будзе сабраць яшчэ блізу 30 тысяч долараў. Пры добрым раскладзе праца над фільмам завершыцца летам 2017 года, тады ж адбудзецца і прэм'ера стужкі.

**Алег ГРУШЭЦКІ**

■ Гастролі

# Знаёмства з тульскімі дзівосамі

## Да 8 сакавіка ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры праходзяць гастролі Тульскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра драмы імя Максіма Горкага

Тульскі акадэмічны тэатр драмы — аднагодак Тульскай губерні, быў заснаваны яшчэ ў 1777 годзе і сустракае сваіх гледачоў ужо 239 сезонаў. Ён прайшоў праз многія выпрабаванні гісторыі: тэатр закранулі і сталінскія рэпрэсіі, і Вялікая Айчынная вайна. Цікава, але нават падчас вайны там давалі спектаклі, ездзілі з «гастролямі» на перадавую і ў воінскія часці. У 1890 годзе ў падрыхтоўцы пастановкі «Плады асветы» браў удзел і яе аўтар, Леў Талстой. У розныя часы наведвальнікамі Тульскага тэатра драмы былі імператрыца Кацярына II, першапраходзец рамантызму ў рускай паэзіі Васіль Жукоўскі, пісьменнікі Міхаіл Салтыкоў-Шчадрын і Глеб Успенскі. Цяпер паглядзець тульскія спектаклі можна і ў Мінску.

Тры з пяці прывезеных у Мінск спектакляў паставіў рэжысёр Дзмітрый Красноў. Яго камедыя «За двума зайцамі» і паклала пачатак гастролям. У нядзелю і панядзелак туляки пакажуць прэм'ерны спектакль «Тульскія дзівосы», мюзікл для сямейнага прагляду па матывах казкі Мікалая Ляскова «Ляўша». Восьмага сакавіка Мінск сустрэнецца з дарослай прэм'ерай, так званай «улётнай» камедыяй «Боінг-Боінг», якую летась паказвалі ў Бабруйску. Французская п'еса «Боінг-Боінг» трапіла ў Кнігу рэкордаў Гінеса за найбольшую колькасць пастановак за мяжой. Сюжэт і інтрыга ў ёй сапраўды французскія: халасцяк Бернар знайшоў для сябе ажно трох нявест-сцюардэс, якія не ведаюць адна пра адну. Але, зразумела, хутка даведаюцца, тайнае стане яўным і для нашага гледача.

Пакуль тульская трупа знаходзіцца ў Мінску, прадстаўнікі нашага музычнага тэатра паказваюць свае спектаклі на сцэне іх тэатра. Гастролі пачаліся з музычнай камедыі «Вяселле ў Малінаўцы», а са старых спектакляў, якія ўжо прыйшліся тульскаму гледачу даспадобы, беларусы пакажуць аперэту «Жанчына-кажан» і балет «Тысяча і адна ноч». Дырэктар Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра Аляксандр Пятровіч зазначыў, што абменныя гастролі паміж Мінскам і Тулай маглі б стаць добрай традыцыяй: «Раз на два гады, калі змяняецца амаль увесь рэпертуар, мы маглі б прыязджаць адзін да аднаго ў госці, каб у сакавіку дарыць жанчынам свае прыгожае мастацтва».

**Дар'я ЧАРНЯЎСКАЯ**




УТВЕРЖДЕНО
Протокол внеочередного общего собрания участников Общества с дополнительной ответственностью «НП-СЕРВИС»
от 16.02.2016 № 10

**ИЗМЕНЕНИЯ 2**
**в Проспект эмиссии облигаций двадцать седьмого выпуска Общества с дополнительной ответственностью «НП-СЕРВИС», утвержденный внеочередным общим собранием участников эмитента 18.11.2015, протокол № 55 (в редакции изменений от 11.01.2016, протокол № 2)**

1. В пункте 2.6 слова «с 04.03.2016 по 20.02.2026» заменить словами «с 18.04.2016 по 10.04.2026».
2. В пункте 2.7 цифры «04.03.2016» заменить цифрами «18.04.2016».
3. В пункте 2.8 слова «(с 04.03.2016 по 03.03.2026)» заменить словами «(с 18.04.2016 по 17.04.2026)».
4. В пункте 2.9 цифры «03.03.2026» заменить цифрами «17.04.2026».
5. В пункте 2.11 слова «с 05.03.2016 по 03.03.2026» заменить словами «с 19.04.2016 по 17.04.2026».
6. В пункте 2.12 таблицу изложить в следующей редакции:

| ПЕРИОД НАЧИСЛЕНИЯ ДОХОДА | | | | Дата формирования реестра владельцев Облигаций для целей выплаты дохода |
|---|---|---|---|---|
| № п/п | начало периода | конец периода, дата выплаты дохода | продолжительность периода, календарных дней | |
| 1 | 19.04.2016 | 30.09.2016 | 165 | 28.09.2016 |
| 2 | 01.10.2016 | 31.03.2017 | 182 | 29.03.2017 |
| 3 | 01.04.2017 | 30.09.2017 | 183 | 27.09.2017 |
| 4 | 01.10.2017 | 31.03.2018 | 182 | 28.03.2018 |
| 5 | 01.04.2018 | 30.09.2018 | 183 | 26.09.2018 |
| 6 | 01.10.2018 | 31.03.2019 | 182 | 27.03.2019 |
| 7 | 01.04.2019 | 30.09.2019 | 183 | 26.09.2019 |
| 8 | 01.10.2019 | 31.03.2020 | 183 | 27.03.2020 |
| 9 | 01.04.2020 | 30.09.2020 | 183 | 28.09.2020 |
| 10 | 01.10.2020 | 31.03.2021 | 182 | 29.03.2021 |
| 11 | 01.04.2021 | 30.09.2021 | 183 | 28.09.2021 |
| 12 | 01.10.2021 | 31.03.2022 | 182 | 29.03.2022 |
| 13 | 01.04.2022 | 30.09.2022 | 183 | 28.09.2022 |
| 14 | 01.10.2022 | 31.03.2023 | 182 | 29.03.2023 |
| 15 | 01.04.2023 | 30.09.2023 | 183 | 27.09.2023 |
| 16 | 01.10.2023 | 31.03.2024 | 183 | 27.03.2024 |
| 17 | 01.04.2024 | 30.09.2024 | 183 | 26.09.2024 |
| 18 | 01.10.2024 | 31.03.2025 | 182 | 27.03.2025 |
| 19 | 01.04.2025 | 30.09.2025 | 183 | 26.09.2025 |
| 20 | 01.10.2025 | 17.04.2026 | 199 | 15.04.2026 |
| ИТОГО: | | | 3651 | |

7. В пункте 2.15 цифры «26.02.2026» заменить цифрами «15.04.2026».

Заместитель директора по финансовым вопросам общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» — И.В.Барон

Директор обслуживающей бухгалтерской организации – ООО «Эккаунт Проф» — Т.Г.Бойкова

Заместитель директора по вопросам казначейства управляющей организации Общества с ограниченной ответственностью «Глера Сигма» — Ю.И.Михайлова

Заместитель директора по вопросам казначейства управляющей организации Общества с ограниченной ответственностью «Глера Полесье-4» — Ю.И.Михайлова

Директор унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» — В.С.Санкович

УНП 100080849




УТВЕРЖДЕНО
Протокол внеочередного общего собрания участников Общества с дополнительной ответственностью «НП-СЕРВИС»
от 16.02.2016 № 10

**ИЗМЕНЕНИЯ 2**
**в Проспект эмиссии облигаций двадцать восьмого выпуска Общества с дополнительной ответственностью «НП-СЕРВИС», утвержденный внеочередным общим собранием участников эмитента 18.11.2015, протокол № 55 (в редакции изменений от 11.01.2016, протокол № 2)**

1. В пункте 2.6 слова «с 04.03.2016 по 20.02.2026» заменить словами «с 18.04.2016 по 10.04.2026».
2. В пункте 2.7 цифры «04.03.2016» заменить цифрами «18.04.2016».
3. В пункте 2.8 слова «(с 04.03.2016 по 03.03.2026)» заменить словами «(с 18.04.2016 по 17.04.2026)».
4. В пункте 2.9 цифры «03.03.2026» заменить цифрами «17.04.2026».
5. В пункте 2.11 слова «с 05.03.2016 по 03.03.2026» заменить словами «с 19.04.2016 по 17.04.2026».
6. В пункте 2.12 таблицу изложить в следующей редакции:

| ПЕРИОД НАЧИСЛЕНИЯ ДОХОДА | | | | Дата формирования реестра владельцев Облигаций для целей выплаты дохода |
|---|---|---|---|---|
| № п/п | начало периода | конец периода, дата выплаты дохода | продолжительность периода, календарных дней | |
| 1 | 19.04.2016 | 30.09.2016 | 165 | 28.09.2016 |
| 2 | 01.10.2016 | 31.03.2017 | 182 | 29.03.2017 |
| 3 | 01.04.2017 | 30.09.2017 | 183 | 27.09.2017 |
| 4 | 01.10.2017 | 31.03.2018 | 182 | 28.03.2018 |
| 5 | 01.04.2018 | 30.09.2018 | 183 | 26.09.2018 |
| 6 | 01.10.2018 | 31.03.2019 | 182 | 27.03.2019 |
| 7 | 01.04.2019 | 30.09.2019 | 183 | 26.09.2019 |
| 8 | 01.10.2019 | 31.03.2020 | 183 | 27.03.2020 |
| 9 | 01.04.2020 | 30.09.2020 | 183 | 28.09.2020 |
| 10 | 01.10.2020 | 31.03.2021 | 182 | 29.03.2021 |
| 11 | 01.04.2021 | 30.09.2021 | 183 | 28.09.2021 |
| 12 | 01.10.2021 | 31.03.2022 | 182 | 29.03.2022 |
| 13 | 01.04.2022 | 30.09.2022 | 183 | 28.09.2022 |
| 14 | 01.10.2022 | 31.03.2023 | 182 | 29.03.2023 |
| 15 | 01.04.2023 | 30.09.2023 | 183 | 27.09.2023 |
| 16 | 01.10.2023 | 31.03.2024 | 183 | 27.03.2024 |
| 17 | 01.04.2024 | 30.09.2024 | 183 | 26.09.2024 |
| 18 | 01.10.2024 | 31.03.2025 | 182 | 27.03.2025 |
| 19 | 01.04.2025 | 30.09.2025 | 183 | 26.09.2025 |
| 20 | 01.10.2025 | 17.04.2026 | 199 | 15.04.2026 |
| ИТОГО: | | | 3651 | |

7. В пункте 2.15 цифры «26.02.2026» заменить цифрами «15.04.2026».

Заместитель директора по финансовым вопросам общества с дополнительной ответственностью «НП-Сервис» — И.В. Барон

Директор обслуживающей бухгалтерской организации – ООО «Эккаунт Проф» — Т.Г. Бойкова

Директор закрытого акционерного общества «Универсам «Центральный» — Ю.С. Рябенков

Директор унитарного предприятия по оказанию услуг на рынке ценных бумаг «АСБ БРОКЕР» — В.С. Санкович

УНП 100080849

## Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:**
**25 марта 2016 г. в 11.00 состоится ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже недвижимого имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Белшина», в составе:**
**Лот № 1 (предмет торгов ): изолированное помещение с инвентарным номером 730/D-7335 (помещение для торговли обувью), общей площадью 84,9 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 10А**

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, (р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369, ОКПО 55484006) |
| **Продавец предмета торгов** | Открытое акционерное общество «Белшина», УНП 700016217, Минское шоссе, 213824, г. Бобруйск, Могилевская область |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация» |
| **Начальная цена продажи, рублей без НДС** | 300 124 500 рублей без учета НДС, задаток 10% от начальной цены продажи – 30 012 450 рублей |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | Получатель платежа ОАО «Белшина» – р/с 3012000003446 в ОАО СБ «Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700016217, ОКПО147621337000 |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 724050100001005437 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 10а, площадь – 0,0161 га, предоставлен для обслуживания предмета торгов. Имущественные права на земельный участок – право аренды, правообладатель – ОАО «Белшина» |
| **Характеристика предмета торгов** | |
| Помещение для торговли находится в одноэтажном кирпичном здании, 1985 г. п., фундамент – кирпич, перекрытие – ж/б, кровля – асбестоцементные волнистые листы, полы – бетон, имеется элетроснабжение | |
| **Условия продажи** | При заключении договора купли-продажи между Продавцом и Покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20% |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| **Условия оплаты** | Определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | **по 22 марта 2016 г. включительно до 16.00** |
| **Победитель (претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов. | |
| **Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Звязда» от 06 августа 2015 г. | |

**Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.00.**

**Открытое акционерное общество «Пивзавод Оливария», 220029, г. Минск, ул. Киселева, дом 30**

# ОАО «Пивзавод Оливария»

**извещает своих акционеров о проведении годового Общего собрания акционеров ОАО «Пивзавод Оливария», которое состоится 28 марта 2016 года в 16.00 в помещении выставочного зала ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, ул. Киселева, дом 30.**
**Форма проведения годового Общего собрания акционеров – очная.**

**Повестка дня годового Общего собрания акционеров:**

1) Итоги финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Пивзавод Оливария» за 2015 г. Основные направления деятельности общества на 2016 г.
2) Отчет Наблюдательного совета о работе в 2015 г.
3) Отчет Ревизионной комиссии о работе в 2015 г.
4) Заключение Ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности ОАО «Пивзавод Оливария» за 2015 г.
5) О результатах аудиторской проверки. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Пивзавод Оливария» за 2015 год.
6) Утверждение результатов распределения прибыли и убытков ОАО «Пивзавод Оливария», выплата дивидендов по итогам работы за 2015 г., определение срока выплаты дивидендов за 2015 г.
7) Избрание членов Наблюдательного совета.
8) Избрание членов Ревизионной комиссии.
9) Утверждение размера вознаграждения и компенсации членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии ОАО «Пивзавод Оливария».
10) Предоставление безвозмездной (спонсорской) помощи.

Список лиц, имеющих право на участие в годовом Общем собрании акционеров **28 марта 2016 года**, составлен на основании реестра акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» по состоянию **на 04 марта 2016 г.**

Материалы к годовому Общему собранию акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» **28 марта 2016 года** по вопросам повестки дня будут представлены для ознакомления акционерам на информационных стендах:

- в административном здании ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: **город Минск, проспект Машерова, дом 19, в рабочие дни в период с 22 по 28 марта 2016 г. с 9.00 до 18.00;**
- в помещении проходной ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: **город Минск, ул. Киселева, дом 30, в рабочие дни в период с 22 по 28 марта 2016 г. с 9.00 до 18.00;**
- в день проведения собрания по месту его проведения.

С информацией о деятельности Общества за отчетный период, лица, имеющие право на участие в собрании могут ознакомиться, начиная **с 7 марта 2016 г.** ежедневно (кроме субботы и воскресенья) в юридической службе ОАО «Пивзавод Оливария» (г. Минск, пр. Машерова, 19, каб. 306) **с 10.00 до 16.00**, а также в день проведения собрания – по месту его проведения.

Регистрация акционеров для участия в годовом Общем собрании акционеров ОАО «Пивзавод Оливария» будет осуществляться **28 марта 2016 года с 15.00 до 15.50** в помещении выставочного зала ОАО «Пивзавод Оливария» по адресу: город Минск, ул. Киселева, дом 30.

Регистрация проводится при предъявлении документа, подтверждающего полномочия на участие в собрании (доверенность) и/или паспорта.

УНП 100128525 ***Наблюдательный Совет ОАО «Пивзавод Оливария»***

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

**07 апреля 2016 года проводит 5-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 70 | Грузовой Урал-4320-0011 ш. 069022 дв. 021252 1987 г. 4 кат. 13129 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 71 | Грузовой Урал-4320-0011 ш. 059281 дв. 935417 1986 г. 4 кат. 16139 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 72 | Седельный тягач МАЗ-537 ш. 83094760 дв. Ф08КТ3145 1983 г. 4 кат. 39433 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 71 000 000 | 7 100 000 |
| 73 | Полуприцеп-тяжеловоз ЧМЗАП-9990 ш. 1983 1985 г. 4 кат. 39433 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 51 000 000 | 5 100 000 |
| 74 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 143097 дв. 575254 1990 г. 4 кат. 48600 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 75 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 161698 дв. 698073 1990 г. 4 кат. 71627 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 76 | Грузовой КамАЗ-4310 ш. 018301 дв. 887733 1986 г. 4 кат. 54859 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 77 | Грузовой КамАЗ-43105 ш. 008764 дв. 949479 1986 г. 4 кат. 53244 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 78 | Грузовой КамАЗ-43106 ш. 0007559 дв. 0811525 1991 г. 4 кат. 94268 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 07 апреля 2016 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 04 апреля 2016 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10-**ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, гарантийный депозит в размере 3 000 000 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, российские рубли – р/с 3012107883087 в Центре банковских услуг №701,ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369 УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. Без НДС.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.**
**Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, auk@bsk.by**

## ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

**17 марта 2016 года на 4-м открытом аукционе проводит 19-й от 24 декабря 2015 года и 3-й от 03 марта 2016 года повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности**

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 293 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 108106026 дв. б/н 1981 г. 4кат. 4 273 км 1991 г. 4 кат. 116657км | г. Дзержинск, в/ч 74962 | 300 000 000 | 30 000 000 |
| 301 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 108106022 дв. б/н 1981 г. 4 кат. 7 044 км | г. Дзержинск, в/ч 74962 | 300 000 000 | 30 000 000 |
| 302 | Гусеничное шасси МТ-ЛБу ш. 108103036 дв. 676282 1981 г. 4 кат. 2 632 км | г. Дзержинск, в/ч 74962 | 300 000 000 | 30 000 000 |
| 51 | Грузовой Урал-4320 ш. 042837 дв. 780511 1985 г. 4 кат. 39434 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |

**Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 17 марта 2016 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 14 марта 2016 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10-**ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, гарантийный депозит в размере 3 000 000 белорусских рублей и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, российские рубли – р/с 3012107883087 в Центре банковских услуг №701,ОАО»БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 369 УНН 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва № корсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893 к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России №30101810400000000225, УНП 101099370, БИК 153001369. Без НДС.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, auk@bsk.by**

# КАХАННЕ І ЛЮБОЎ КАНДРАТА КРАПІВЫ

## Рамантычныя і сямейныя гісторыі славутага байкапісца

**Ён любіў гуляць у шахматы, а на дачы ў Ждановічах вырошчваў кукурузу. Быў добрым псіхолагам і заўважаў нават самыя маленькія дробязі. Усё жыццё пісаў байкі, п'есы, раманы на адной нямецкай друкарцы «Фартуна», дзе нямецкія літары былі заменены на беларускія, і цягам чвэрці стагоддзя займаў пасаду віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі.**

**Кандрат Крапіва (сапр. Кандрат Атраховіч) — на працы — строгі, нават суровы кіраўнік, мудры настаўнік і вядомы драматург, байкапісец, дома быў ласкавым мужам, клапатлівым бацькам і ўважлівым дзедам. Вось такога Кандрата Кандратавіча — не схематычнага, не забранзавелага, а роднага і блізкага — мы сёння, у дзень 120-годдзя класіка, ўспамінаем з яго ўнучкай Аленай Атраховіч. Менавіта яна цяпер з'яўляецца ўладальніцай аўтарскіх правоў на творы дзеда, апякуецца яго духоўнай спадчынай і марыць пра стварэнне музея Крапівы.**


Кандрат Крапіва, 1980-я.

### ЗВЫЧКІ — СЯЛЯНСКІЯ

З гадамі постаці, вобразы вядомых людзейператвараюцца проста ў схемы: знікаюць рысы індывідуальнасці, за пералікам творчых дасягненняў, узнагарод адыходзіць у цень характар. Алена Ігараўна кажа, што сёння сваю ролю бачыць у тым, каб шырока, маштабна расказваць пра дзеда, каб у гісторыі застаўся цэласны вобраз чалавека. Напрыклад, яго звычкі.

— Звычкі Кандрата Кандратавіча можна назваць... сялянскімі. Ён жа сам з сялянскага роду, прадзед, дзед былі прыгоннымі, нават бацька нарадзіўся яшчэ пад прыгонам, — расказвае Алена Атраховіч. — Ён і вырас у вёсцы. Такой сялянскай звычкай магу назваць працавітасць, неверагодную працаздольнасць. Дзядуля з дзяцінства зведаў гэтую долю. Шмат было сялянскай працы, вельмі цяжкай. Ён успамінаў, як яшчэ малога маці брала яго ў поле, а калі быў падлеткам — ужо і сам за плугам хадзіў. У бацькоў не было асаблівай сістэмы выхавання — дзеці выхоўваліся працай. Гэта засталося на ўсё жыццё. Колькі я памятаю свайго дзядулю, ён увесь час працаваў. Мог сядзець за пісьмовым сталом дапазна, казаў так: «Не трэба чакаць натхнення, трэба садзіцца і працаваць. Тады і натхненне з'явіцца».

Дарэчы, гэтая звычка стала добрым прыкладам і для дзяцей, унукаў. Бачылі, што ў сям'і не толькі адпачываюць, тэлевізар глядзяць, але і працуюць. Прыйдзе дзед дахаты, адпачне гадзіну-другую — і зноў за пісьмовы стол. І так усё жыццё. Практычна да апошніх дзён. Нават калі ён пайшоў з жыцця, то на пісьмовым стале засталіся нататкі. І ва ўзросце 95 гадоў яшчэ строіў планы, марыў стварыць слоўнік беларускіх прыказак і прымавак. Але ў чарнавіках засталіся толькі прыклады на літару «А»...

Звычку многа хадзіць Алена Ігараўна таксама называе ў ліку вясковых. Калі Крапіва быў малады, то на вучобу ў Стоўбцы з Нізка, што на Уздзеншчыне, нярэдка хадзіў пешкі. Пазней пераведзены ў вучылішча ў Койданаве (сёння Дзяржынск) — і туды таксама хадзіў. А гэта і няблізкі, і няпросты шлях: праз лясны гушчар. Унучка ўспамінае, што ў Крапівы была лёгкая паходка і ён з задавальненнем выпраўляўся на доўгія прагулкі.

— У дзядулі быў яшчэ адзін любімы занятак, але ўжо хутчэй гарадскі, — дадае Алена. — Крапіва заўсёды ўважліва вывучаў прэсу, выпісваў шмат газет. І вельмі любіў чытаць «Звязду», нават сам публікаваў у «Звяздзе» свае байкі, шмат гадоў сябраваў з газетай.

### ЯГО ЖАНЧЫНЫ

У лёсе кожнага чалавека маюць ролю не толькі прафесійныя дасягненні, абставіны грамадскага жыцця, але і сям'я. Той, хто крочыць па жыцці побач, — не менш важная частка асабістага сусвету творцы. Якія жанчыны цягам яго доўгага жыцця суправаджалі выдатнага пісьменніка, натхнялі на творчасць? На гэтае пытанне Алена Атраховіч адказвае ахвотна і падрабязна: было ў Крапівы і рамантычнае першае каханне, і шчаслівы шлюб, які доўжыўся больш за 40 гадоў... Але пачалося ўсё з маці.

— На жаль, яго мама, Пелагея Данілаўна, доўга не пражыла. Яна памерла, калі дзеду было 10 гадоў, — кажа Алена Ігараўна, — Але ён памятаў сваю маму, расказваў пра яе. Яна была вельмі сціплая і добразычлівая жанчына, вельмі ахайная. Мне здаецца, што менавіта ад яе дзядуля пераняў гэтую неверагодную акуратнасць, амаль педантычнасць. Яна была ціхая, сціплая, вельмі добра спявала беларускія песні. У яе было аж дзевяцёра дзяцей, але выжылі толькі двое — Кандрат Кандратавіч і старэйшая сястра Ганна.

З Ганнай Крапіва сябраваў усё жыццё. Калі маці памерла, то менавіта яна дапамагала яго даглядаць, пакуль не выйшла замуж. Старэйшая сястра пражыла звычайнае спакойнае жыццё. Выгадавала двух сыноў. Ведала шмат старажытных беларускіх песень.

— Мая мама ўспамінае, як на іх з татам вяселлі яна неверагодна прыгожа спявала. Я таксама добра памятаю цётку Ганну. Была высокая, стройная, з прыгожымі рукамі — з доўгімі пальцамі і вузкімі шляхетнымі далонямі, — дадае Алена Атраховіч.

Але была ў лёсе Крапівы адна жанчына, якая адыграла адмоўную ролю, — мачаха Домна. Калі маці памерла, бацька ажаніўся спачатку з адной жанчынай, але яна была кволая і доўга не пражыла, а пасля з'явілася другая. Здаровая, моцная, гаспадарлівая, ды характарам злосная, крыклівая. Вельмі не любіла, калі Крапіва чытаў кніжкі, лічыла, што гэта панскі занятак, чытаць можна, толькі калі больш няма чаго рабіць. Нават крычала: «З кнігі ты хлеба есці не будзеш».


На старым фотаздымку ўся сям'я. Злева направа. Стаяць: дачка Крапівы Людміла і нявестка Зоя, сядзяць: Кандрат Крапіва, яго жонка Алена Канстанцінаўна і сын Ігар.

### КАХАННЕ САЛДАТА КАНДРАТА

— Дзядуля з цеплынёй распавядаў гісторыю свайго першага кахання, і гэта яшчэ не была мая бабуля, — інтрыгуе Алена Атраховіч. — Гэта проста рамантычная гісторыя, якая здарылася ў юнацтве, але мела цікавы працяг у сталасці.

А было ўсё вось як: ішла імперыялістычная вайна. 1915 год, Крапіву прызвалі на ваенную службу ў царскую армію. Ён скончыў Гатчынскую школу прапаршчыкаў і быў накіраваны на службу ў горад Асташкаў на прыгожым возеры Селігер. Там служыў вясну і лета 1916 года. Асташкаў — горад, вядомы сваім культурным асяродкам; тут быў славуты тэатр, дзе ставілі п'есы Грыбаедава, не прапраўленыя цэнзурай, а таксама багатая бібліятэка. І вось менавіта ў бібліятэцы Крапіва пазнаёміўся з гімназісткай Кацярынай, дачкой заможнага купца. Яны разам чыталі кнігі, абмяркоўвалі іх, а пасля і закахаліся адно ў аднаго, пачалі сустракацца. Марылі, што кожны з іх зробіць нешта важнае для краіны.

Але сталася так, што бацька Кацярыны паабяцаў выдаць яе замуж за багатага унтэр-афіцэра. Як яна ні плакала, як ні прасіла — воля бацькі была выканана. Кацярына выйшла замуж... Восенню прыйшла вестка, што Крапіву адпраўляюць на румынскі фронт. Кацярына, хоць ужо была замужняй, прыбегла да яго ў часць, каб развітацца, і падарыла талісман-сімвал — сярэбраны рубель з выявай імператрыцы Кацярыны. Іх сцежкі разышліся.

Кандрат і Кацярына больш ніколі не пабачыліся, але... перапісваліся да самай смерці. Алена Ігараўна раскрывае інтрыгу:

— Цікава, што ўжо ў другой палове XX ст. Кацярына знайшла Крапіву. Пачула пра яго па ўсесаюзным радыё і праз Маскву, Саюз пісьменнікаў, даведалася адрас, напісала ліст. Як Крапіва здзівіўся, калі пабачыў на канверце, што прыйшла вестка з Асташкава! Не адразу, але адказаў, завязалася перапіска на доўгія гады. Кацярына была вельмі актыўная, пасля рэвалюцыі працавала старшынёй саўгаса. А калі ёй споўнілася 90 гадоў, Крапіва павіншаваў сяброўку і напісаў «У нашым палку доўгажыхароў прыбыло!».

### ШЛЮБ НА ЎСЁ ЖЫЦЦЁ

Слухаючы пра такое неверагоднае завяршэнне гісторыі першага кахання Крапівы, здзіўляюся: у яго на той час ужо была сям'я, няўжо жонка Кандрата Кандратавіча і бабуля Алены Ігараўны не раўнавала мужа?

— Ды не, — смяецца спадарыня Алена, — яны нават разам чыталі лісты Кацярыны, а перапіска была надзвычай цырымонная: паважаны Кандрат Кандратавіч, шаноўная Кацярына Пятроўна. Ды і мая бабуля Алена Канстанцінаўна была, бадай, самай галоўнай жанчынай у жыцці Крапівы. Нейкага бурнага кахання паміж імі не існавала, але было вельмі глыбокае, спакойнае пачуццё, узаемная згода і разуменне. Ды і гісторыя іх сустрэчы вельмі простая.

Быў 1918 год. Крапіва дэмабілізаваўся з войска, прыехаў у родны Нізок. Там убачыў дзяўчыну Алену, прыгожую, гарэзлівую, вясёлую. Даведаўся, што яна з сям'і прыезджых з суседняй вёскі пагарэльцаў. Алена яму вельмі спадабалася, ажаніўся з ёй нават насуперак волі бацькі, той быў супраць шлюбу, бо дзяўчына не мела ніякага пасагу. А пазней нават паўтарыў яе вобраз у рамане «Мядзведзічы» — вельмі аўтабіяграфічным творы, дзе апісваюцца жыхары Нізка, розныя гісторыі з іх жыцця. Вось як апісвае Крапіва гераіню Зосю: «Прыгожая ды прыветная. Засмяецца — здаецца, сонца выбліснула ў хмарны дзень. Аж усярэдзіне цёпла ад гэтай усмешкі. За харáство і вось гэтую цёплую ўсмешку і ўзяў яе ў жоны».

— Гэта якраз пра маю бабулю! — падкрэслівае Алена Атраховіч. — Яна так сонечна ўсміхалася, была вясёлая, гаваркая, многа смяялася. Менавіта яна прынесла ў жыццё дзядулі гэты сонечны праменьчык. Крапіва вельмі любіў, калі ў сям'і ўсё па-добраму, можна і пагутарыць, і пасмяяцца. Так разам яны пражылі больш як 40 гадоў. Але, на жаль, бабуля цяжка захварэла і досыць рана пайшла з жыцця. Першы год пасля яе смерці Крапіва кожны дзень, едучы з працы, наведваў яе на могілках. І цягам дзесяці год пасля спачыну бабулі ў дзень яе смерці збіраў усю сям'ю дома. Мы разам успаміналі яе. Неаднаразова дзед атрымліваў прапановы зноў ажаніцца, але адмаўляў, казаў: «У мяне ўжо ёсць сям'я».

### НЯВЕСТКА, ДАЧКА, ПРАЎНУЧКА

Ёсць у Крапівы п'еса «На вастрыі» — пра ўрачоў, калектыў супрацоўнікаў бальніцы. Адну з галоўных гераінь завуць Зоя. Яна старшая медсястра аддзялення. Вельмі ўважлівая да пацыентаў, добрая і клапатлівая. У гэтай гераіні таксама ёсць прататып — нявестка, урач па прафесіі, якую завуць таксама Зоя.

— Так, гэта мая мама, Зоя Мікалаеўна, — расказвае Алена Ігараўна. — У пасляваенныя гады яны з татам — сынам Крапівы Ігарам — спачатку пазнаёміліся як суседзі, пачалі сябраваць. А ўжо потым сталі сям'ёй, і Крапіва ставіўся да яе як да дачкі, з цеплынёй прыняў. Калі дзядуля ўжо стаў старэнькі, яго апанавалі хваробы, дык мая мама вельмі клапатліва яго даглядала, дапамагала змагацца з хваробамі, падтрымліваць здароўе ў належным стане, выконваць рэжым дня.

Была ў Кандрата Кандратавіча і любімая дачка Людміла. Алена Ігараўна ўспамінае, што яна была вельмі прыгожая, зграбная і надзвычай таленавітая, добра спявала і марыла стаць актрысай. Але цяжкая хвароба не дазволіла здзейсніць задумкі і рэалізаваць талент. Людміла памерла досыць рана, сам Крапіва скрушна казаў: «Адмучылася мая дачушка...»

Кандрат Кандратавіч вельмі любіў дзяцей. З ахвотай пазычаў суседскім школьнікам кнігі з хатняй бібліятэкі, а калі вярталі — абмяркоўваў з імі прачытанае. Таму і да ўнукаў, праўнукаў ставіўся з неверагоднай цеплынёй.

— Мая дачка Варвара, праўнучка Крапівы, была не толькі яго добрай сяброўкай, але і натхніла на напісанне новай кнігі, — кажа Алена Атраховіч. — Варвара вельмі любіла з дзядулем гуляць у словы. Ён чытаў ёй уголас і прыдумляў філалагічныя гульні. Праз некаторы час з іх атрымалася кніга «Загадкі дзеда Кандрата».

Дарэчы, сёння Варвара ўжо гадуе свайго сына, працуе над кандыдацкай дысертацыяй па паліталогіі ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. А сама Алена Ігараўна загадвае кафедрай мадэлявання касцюма ў Інстытуце сучасных ведаў імя А. Шырокава. Напэўна, у свой час Крапіва ганарыўся поспехамі ўнучкі. Таму пытаюся, чаму яна так сціпла абышла ўвагай сябе, не вызначыла ўласную ролю ў жыцці славутага дзеда?

— Спадзяюся, што я не падвяла дзядулю: добра ў свой час вучылася, навукай займалася, як ён мне раіў, кандыдацкую дысертацыю па мастацтвазнаўстве абараніла. Не расчаравала пры яго жыцці, — адказвае Алена Ігараўна. — Але і сёння бачу сваю вельмі значную грамадскую ролю — займаюся яго духоўнай спадчынай, вывучаю яго жыццё па дакументах, пішу кнігу пра дзеда.

### ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ ДЗЕДА

Цікава, а ці з'яўляецца дзень нараджэння дзеда святам для сям'і Атраховіч? Ці згадваюць яго? Унучка кажа:

— Мы яго і так памятаем, часта наведваемся на Усходнія могілкі, дзе дзядуля пахаваны. Ведаеце, калі пабудзеш на яго магіле, то неяк лёгка становіцца на душы. Ён быў вельмі светлы чалавек. Таму і ўспамінаем мы яго ў сям'і з вельмі светлым пачуццём. Ён у душы быў добразычлівы, хоць і строгі, магчыма, нават суровы. Натуральна, штогод усёй сям'ёй адзначаем дзень нараджэння Крапівы.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

**Фота з сямейнага архіва Алены АТРАХОВІЧ**



Фота слова
Яўгена ПЯСЕЦКАГА

*Што было спачатку на Зямлі?*
*Ці зіма ўладарыла, ці лета?*
*Я спытаў пра гэта у паэта.*
*Адказаў той: кветкі ўсюль былі.*

*Хто ішоў найпершым па Зямлі?*
*Лёгкаю жаночаю хадою*
*Ці мужчынскаю, цяжкой ад зброі?*
*Адказаў паэт: жанчыны йшлі.*

*Выракаю ўсіх тэорый гмах,*
*Веру толькі гэтаму паэту:*
*Ты з вясновай кветкай у руках*
*Па Зямлі ідзеш з пачатку Свету.*


# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **ЛОТ №1. ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ с инв. № 200/D-152157 (наименование – административно-лабораторный корпус, назначение – административное помещение) общая площадь 1911,7 м², стоимостью 3 460 200 000 белорусских рублей** |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Научно-производственное опытно-конструкторское бюро машиностроения» (УНН 300048064) |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-3А |
| Наличие обременений | нет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 22.03.2016 в 11.00 г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.3 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б.Хмельницкого, д. 10/1. (www.vitebskjust.gov.by) Судебный исполнитель Зиновенко Олег Олегович, тел. (80212) 61-40-22, моб. +375336879159, начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212) 61-40-15 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет Главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, **не позднее 15.00 21.03.2016 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |


■ Подыум

**Яніна ГАНЧАРОВА:**

# «МЯНЯЦЬ ГАРДЭРОБ КОЖНЫ СЕЗОН НЯМА СЭНСУ»

**У 2010 годзе, калі ў Беларусі ладзіўся першы тыдзень моды, гэта задума здавалася правальнай: ну якая мода ў нашай краіне? Цяпер, праз шэсць гадоў, скептыкаў куды менш. Кожны сезон дызайнеры даказваюць: нам ёсць, што паказаць. Ужо праз месяц стартуе чарговы тыдзень моды, дзе мадэльеры прадставяць калекцыі на восень і зіму. А мы тым часам вырашылі сустрэцца з кіраўніком аргкамітэта праекта Янінай ГАНЧАРОВАЙ і паразмаўляць пра дрэс-код на паказах, цэны на дызайнерскае адзенне і безгустоўнасць на вуліцах.**

***— Ці шмат часу ідзе на арганізацыю тыдня моды?***

— Як і любое маштабнае мерапрыемства, тыдзень моды патрабуе якаснай падрыхтоўкі. Самыя важныя пытанні, такія як супрацоўніцтва з партнёрамі, дата і месца правядзення, вырашаюцца яшчэ за год. Аднак найбольш актыўная падрыхтоўка вядзецца за некалькі месяцаў да праекта. Задзейнічана вялікая колькасць людзей, бо акрамя паказаў на асноўнай пляцоўцы трэба арганізоўваць конкурсы маладых дызайнераў і модных блогераў, працаваць з дзіцячымі брэндамі і міжнароднымі СМІ. Стараемся, каб беларускі тыдзень моды стаяў на адным узроўні з еўрапейскімі.

**«Самы галоўны маветон, які ніяк не могуць засвоіць жанчыны ў нашай краіне, — гэта калготкі бэжавага колеру. У свеце моды гэты прадмет гардэробу — жорсткае табу».**

***— Колькі каштуе правесці такое мерапрыемства?***

— Суму агучваць не буду, але скажу, што праект дарагі. І, як паказвае практыка, эканоміць нельга ні на чым. Важна прадугледзець усё, удзяліць належную ўвагу кожнай дэталі, якія не бачныя для звычайных наведнікаў. Гэта выдаткі на высокія тэхналогіі і апаратыўнасць: якасныя відэа- і фотаздымкі, анлайн-трансляцыю. Не кажучы ўжо аб адміністрацыйнай працы тых людзей, якія на працягу ўсяго дня абслугоўваюць праект.

З сезона ў сезон мы супрацоўнічаем на ўзаемавыгадных умовах з фінансавымі партнёрамі. Адшукаць іх і заключыць дамовы — складаны і доўгі працэс. Прытым гарантый у далейшым супрацоўніцтве няма. Прыцягваем, як правіла, буйныя паспяховыя кампаніі з падобнай мэтавай аўдыторыяй. А на дзіцячыя паказы і паказы маладых дызайнераў патрэбны асобныя партнёры, якім будуць цікавыя менавіта гэтыя праекты.

***— Пытанне ад патэнцыяльных гледачоў: у чым прыходзіць на модныя паказы?***

— Тут кожны прытрымліваецца таго, што яму падабаецца, але важна выглядаць акуратна і невульгарна. Можна зрабіць некалькі акцэнтаў, каб граматна падкрэсліць свой стыль. Ваш вобраз таксама можа залежаць ад дызайнера, на паказ якога вы прыйшлі. Падбярыце ўбор так, каб выглядаць адпаведна канцэпцыі брэнда. Адзначу, што добрым правілам стала прыходзіць на паказ у адзенні дадзенага мадэльера.

***— А чаго чакаюць ад дызайнераў на тыдні?***

— Крытыкі — якаснага, запамінальнага шоу, непаўторнага аўтарскага стылю і элемента навізны. Пакупнікі ў сваю чаргу хочуць убачыць стыльнае, практычнае адзенне.

***— Калі можна сказаць, што дызайнер паспяховы?***

— Любы брэнд можнаназваць такім, у першую чаргу, калі ён становіцца вядомым і запатрабаваным. Дызайнеру неабходна штосезонна радаваць прыхільнікаў новымі калекцыямі і захоўваць пры гэтым свой стыль і падачу. Пастаяннае развіццё, праца і нацэленасць на міжнародны рынак — верны залог поспеху брэнда.



Фота Пятра ВІННІЧКА.

***— Часта можна пачуць, што беларускія мадэльеры шыюць не для беларусаў: занадта дорага. Што скажаце? Ёсць дызайнеры, чые рэчы сабе можа дазволіць набыць чалавек з сярэднестатыстычным заробкам?***



— Варта адзначыць, што дызайнерскае адзенне ў любой краіне свету каштуе нямала. Усё залежыць ад матэрыялаў, якія выкарыстоўваліся, працаёмкасці работы — часта гэта ручная праца і адзінкавыя мадэлі. У любым выпадку рэч эксклюзіўная, з непаўторным дызайнам ніколі не будзе мець рыначнага кошту. Таму ва ўсе часы дазволіць сабе індывідуальны стыль маглі толькі забяспечаныя людзі. Сёння, дзякуючы таму што кожны можа ўбачыць мадэлі з подыума, жанчына можа знайсці альтэрнатыву ў брэндах, даступных яе бюджэту.

***— Беларуская мода адстае ад таго, што адбываецца ў Еўропе і свеце?***

— Сёння смела можна казаць, што не. Дзякуючы сучасным сродкам камунікацыі, свет адкрыты, інфармацыя распаўсюджваецца імгненна, што дазваляе быць на адной хвалі з астатнімі краінамі, пастаянна ўзаемадзейнічаць і падтрымліваць сувязі. Безумоўна, для беларускай моды прагрэс адкрыў новыя магчымасці і перспектывы.

***— Тэндэнцыі ў модзе часта змяняюцца. Як думаеце, абнаўляць гардэроб варта таксама кожны сезон?***

— У гэтым няма сэнсу. За ўсімі трэндамі ўсё роўна не ўгнацца. Лепш удзяліць увагу пошуку ўласнага ўнікальнага стылю і толькі часам дапаўняць яго ультрамоднымі мадэлямі. Базавыя рэчы мусяць быць асновай вашага гардэробу, на іх эканоміць не варта. Зрабіце акцэнт на якасць і ўніверсальнасць.

***— А якія рэчы на піку моды ў гэтым сезоне?***

— Вінтаж заўсёды быў папулярны, і сёлета ён толькі ўзмоцніць свае пазіцыі. Пагадзіцеся, што цяпер усе імкнуцца да ўнікальнасці. Рэчамі з апошніх калекцый ужо нікога не здзівіш. Усе хочуць знайсці што-небудзь эксклюзіўнае, а самае даступнае з эксклюзіву — вінтажнае адзенне. Гэты бум на вінтаж добра прасочваецца ў папулярных модных блогераў.

***— А што з таго, што заўважаеце на вуліцах, вам здаецца безгустоўнасцю? Ад якіх рэчаў даўно пара пазбавіцца?***

— Пра безгустоўнасць у модзе можна казаць, напэўна, бясконца. Напрыклад, раней лічылася правільным падбіраць аксесуары ў тон абутку, цяпер жа такі прыём — маветон. Вядома ж, ёсць пэўныя рэчы, якія нават сярод людзей, што не маюць ніякага дачынення да моды, непрымальны для ноські. Гэта «вязаныя» боты, адзенне кіслотных адценняў, капелюшы і футболкі з надпісамі, дзе часцяком утрымліваецца ненарматыўная лексіка. Натуральна, з кожным годам спіс вопраткі, што з'яўляецца паказчыкам безгустоўнасці, папаўняецца. Але, напэўна, самы галоўны маветон, які ніяк не могуць засвоіць жанчыны ў нашай краіне, — гэта калготкі бэжавага колеру. У свеце моды гэты прадмет гардэробу — жорсткае табу, але нашы дзяўчаты ўмудраюцца іх надзець не толькі пад басаножкі з адкрытым носам, але і пад зімовыя боты з пухавіком. Акрамя таго, што такое спалучэнне выглядае недарэчна, гэта небяспечна для здароўя.

***— Быць модным і стыльным — у чым розніца?***

— Можна быць модным, але пры гэтым застававацца без уласнага стылю. Стыль — гэта асабістае ўспрыманне чалавекам яго наваколля і адлюстраванне ўнутранага свету. Каб быць стыльным, зусім не абавязкова апранацца ў знакамітых дызайнераў і мець вялікую гардэробную. Дастаткова граматна падыходзіць да выбару рэчаў і прапускаць іх праз прызму вашай індывідуальнасці. Тут недарэчнай будзе формула «больш — лепш». А вось каб быць модным, дастаткова сачыць за апошнімі тэндэнцыямі і мець кашалёк патаўсцей.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*



# ВЯШЧУН З БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ

## РОБІЦЬ ПУЭР З БЯРОЗАВАГА ЛІСЦЯ І ЛАДЗІЦЬ ЧАЙНЫЯ ЦЫРЫМОНІІ З НАЦЫЯНАЛЬНЫМ КАЛАРЫТАМ

**З Аляксеем КУПРАКОВЫМ я пазнаёмілася ў Мінску на другім Чайным чэмпіянаце. Малады брастаўчанін адразу ж прыцягнуў увагу незвычайным ільняным уборам. І, вядома, уразіў тым, што заварваў чай не ў фарфоравым ці шкляным імбрыку, а ў гліняных збанках ды чыгунку...**

## «МОЙ ДЗЕД ЗАГАДВАЎ ЧАЙНАЙ ПАСЛЯ ВАЙНЫ»

Працягваў здзіўляць Аляксей і падчас нашай размовы. Сказаў, напрыклад, што не толькі ў Японіі ды Кітаі, але і ў Беларусі ёсць свае чайныя традыцыі. Проста пра гэта мала хто ведае.

— Мая першая сустрэча з чаем адбылася ў дзяцінстве дзякуючы дзядулю. Яго таксама звалі Аляксей Купракоў. На ягоны век выпала Вялікая Айчынная вайна. Ён яе ўсю прайшоў — ад Масквы да Берліна. Да самай сваёй смерці дзед насіў пад сэрцам аскепкі, атрыманыя пры раненні... **Памятаю, ён заўсёды піў моцна завараны чай без цукру. І ўсе ў сям'і казалі, што дзед любіць добры чай. Я тады зразумець не мог, што там добрага — ён быў нясмачны і горкі. Але пытанне — што такое добры чай? — ужо тады зарадзілася ўва мне.** Аказалася, што пасля вайны дзядуля быў загадчыкам чайнай у пасёлку Шэрашава Пружанскага раёна! Бацькі мне пра гэта расказалі са смехам, пасля таго, як я адкрыў антыкафэ «Чайны домік» у Брэсце. Маўляў, гены далі пра сябе знаць.


Падчас партыі ў Го (Аляксей — *злева*). Менавіта стратэгія гэтай гульні дазволіла Кітаю і Японіі стаць эканамічнымі лідарамі.

Думаю, дзед вельмі ўзрадаваўся б, калі б даведаўся, што ўнук працягвае яго справу. Больш за тое, яшчэ і перамагае ў чайных чэмпіянатах (летась — у катэгорыі «Майстэрства заварвання чаю», сёлета — у намінацыі «Майстэрства дэгустацыі»).

— Другая сустрэча з гарбатай адбылася ў падлеткавым узросце! — працягвае Аляксей. Я тады трапіў у дрэнную кампанію. Мы бавілі час у двары, пілі алкаголь. У суседнім доме жыў хлопец-сірата. Я вырашыў з ім пасябраваць, бо ён меў асобную кватэру, дзе можна было тусавацца. Менавіта той хлопец паказаў мне альтэрнатыўны спосаб баўлення часу: шахматы, сярэднявечную музыку і зялёны чай без цукру... Такім вось чынам ён выцягнуў мяне з «чарнухі». Я дагэтуль вельмі ўдзячны яму за той выратавальны дэфіцытны зялёны чай (тады, у 90-х, яго амаль нідзе не было).

Дзіўным чынам спалучэнне добрай музыкі, чаю і шахмат пасля набыло ўвасабленне ў «Чайным дамку» Аляксея Купракова. Па волі лёсу ў арэнду ўдалося ўзяць частку памяшкання шахматна-шашачнага клуба, што ў Брэсцкім парку культуры і адпачынку. Наведвальнікаў там прымаюць ва ўтульнай хатняй абстаноўцы і не за звычайнымі, а за шахматнымі столікамі. Прапаную інтэлектуальнае меню і гарбату.

— Я рады, што замест тэлефонаў і планшэтаў моладзь трымае ў руках кніжкі мудрасці і гуляе ў шахматы. У прыярытэце ўсходняя тэматыка. Таму нават шахматы не звычайныя, а Го. Гэтая старадаўняя гульня сёння адна з нешматлікіх, дзе камп'ютар пакуль не можа выйграць у чалавека. Яна выдатна развівае логіку. Цудоўна было б прэзентаваць беларускай бізнес-супольнасці Го як цудоўны інструмент для развіцця менеджарскага мыслення. Бо менавіта стратэгія гэтай гульні дазволіла Кітаю і Японіі стаць эканамічнымі лідарамі.

## У ЧАТЫРЫ ГАДЫ ВЫРАСЦІЎ З КОСТАЧКІ ГРЭЙПФРУТ

Усходняй культурай Аляксей захапіўся, яшчэ калі вучыўся ў медыцынскім каледжы. Тады ж пачаў пісаць хайку і нават выйграў міжнародны конкурс японскай паэзіі. Затым атрымаў вышэйшую адукацыю — стаў псіхолагам, скончыў магістратуру. Быў у няўрымслівага хлопца яшчэ і досвед працы масажыстам па ўсходняй методыцы. Нейкі час праводзіў аздараўленчую гімнастыку ў розных медустановах горада.

— Менавіта ад аздараўленчых практык я і прыйшоў да чайнай культуры як да цудоўнага спосабу псіхатэрапіі без псіхатэрапеўта. Замест таго, каб звяртацца да псіхолага, можна завітаць да чайнага майстра. Сам фармат чайнай цырымоніі спрыяе нязмушаным зносінам. Да таго ж кітайскі чай з'яўляецца пэўнага роду легальным псіхадэлікам: ёсць 7 відаў ферментацыі, і можна падабраць у залежнасці ад стану. Больш за тое, ён спрыяе духоўнаму развіццю. У чалавека, які ўжывае добра прыгатаваны чай, абвастраецца ўспрыманне, ён лёгка можа зразумець класіку. Чайны стан падобны да алкагольнага па сіле, але процілеглы па дзеянні.

Адказ на пытанне, што ж такое добры чай, Аляксей знайшоў падчас працы ў кампаніі «Пушчанская тайна».

— Мы з кіраўніком выбіралі, што выпускаць — прыправы або гарбату. Я знарок прайшоў навучанне ў чайнай школе Таццяны Петраковай. Аднак у кампаніі выбралі прыправы.

Чайныя веды спатрэбіліся Аляксею пазней, калі ён адкрыў свой «Чайны дамок» і пачаў праводзіць чайныя цырымоніі.

— Калі я працаваў з «Пушчанскай тайнай», у мяне быў вельмі багаты на паездкі ў Піцер год. Мы вазілі туды саджанцы маліны. Я там пазнаёміўся з піцерскімі антыкаварнямі, улюбіўся ў гэты фармат. І стаў марыць, незалежна ад таго, будзе гэта прыбыткова ці не, стварыць у Брэсце першую антыкаварню. На мой погляд, **менавіта сямейны бізнес можа падняць эканоміку ўсёй краіны. Такі бізнес — доўгачасовы. У ім ніколі не будзе карупцыі. Сваё імя ніякі чалавек не захоча ачарніць. Ён будзе з усіх сіл старацца працаваць.**



Аляксей КУПРАКОЎ прэзентуе свой унікальны арт-праект «Беларуская чайная цырымонія».

Гаспадарскія здольнасці ў Аляксея праявіліся яшчэ ў чатыры гады — тады хлопчык змог вырасціць з костачкі грэйпфрут... З таго часу ён пастаянна нешта прыдумляе, вынаходзіць...

— Я па натуры крэатыўшчык. Не магу доўга рабіць нешта адно. Пасля перамогі на чайным чэмпіянаце ў Беларусі і выхаду на міжнародны ўзровень у мяне знікла адчуванне межаў. Цяпер я перадаў «Чайны дамок» у добрыя рукі, а сам буду займацца іншымі, больш маштабнымі праектамі... Сёння мой далейшы рух, імкненне да здаровага ладу жыцця прывялі мяне да экалогіі. Я ўзначаліў брэсцкі «Зялёны партал» (афіцыйна адкрыўся 1 сакавіка). Гэта першы рэсурс, дзе будзе ўся інфармацыя пра экалогію Брэсцкай вобласці. Мне не падабаецца статычнае развіццё, я лічу: дабіўся поспеху, пераключайся. Інакш па законах кітайскай філасофіі наступае фаза згасання.

## ПУШЧАНСКАЯ МЕККА

Але з гарбатай і цырымоніямі Аляксей развітвацца не збіраецца. На другім Чайным чэмпіянаце ён прэзентаваў свой унікальны арт-праект «Беларуская чайная цырымонія». Заварваў спалучэнне чаёў у стылі беларускага сцяга.

— Наш сцяг складаецца з двух частак чырвонага, адной часткі зялёнага і адной часткі белага колеру. Якраз ёсць такія віды ферментацыі чаю: чырвоны, зялёны, белы. На гэты раз зялёны замяніў на светла-бірузовы — гэта быў слабаферментаваны малочны ўлун. Звычайна ў чайнай культуры высокага ўзроўню ён не выкарыстоўваецца. Але тут у мяне была адмысловая місія: падкрэсліць нацыянальную кераміку, выкананую ў тэхніцы малачэння, якую мы спецыяльна распрацоўвалі з брэсцкімі ганчарамі. Яна сама па сабе дае водар малака, і калі яшчэ падкрэсліць малочным улунам, то атрымліваецца вельмі гарманічнае спалучэнне.

Шмат тысяч гадоў развівалася ўсходняя чайная культура, і, калі казаць мовай IT-тэхналогій, рухавічок даўно вызначаны. Можна вельмі прыгожа яго «перапрашыць» пад беларускі інтэрфейс і праз яго прадставіць нашу культуру ва ўсёй паўнаце. Традыцыйны касцюм, кераміку, музыку... Для музычнага аздаблення на гэты раз я выбраў цымбалы, бо яны ёсць як у беларускага народа, так і ў кітайскага. Гэта добрая кропка інтэграцыі. У гэтым чэмпіянаце трэба было выкарыстоўваць лісце кітайскай гарбаты. А наогул арт-праект «Беларуская чайная цырымонія» я прасоўваю, вядома ж, з беларускімі зёлкамі. У сукупнасці гэта дае больш поўнае ўяўленне пра нашу культуру. І я ўжо прапанаваў Міністэрству замежных спраў выкарыстоўваць гэты арт-праект для прыёму замежных дэлегацый. Думаю, што наша супрацоўніцтва прынясе карысць радзіме.

Што тычыцца строю, то ўзяў за аснову традыцыйны беларускі, з вышыўкай. І ўнёс туды элементы чайных касцюмаў. Тут гэтую ролю сыграла падаўжэнне рукавоў, дзякуючы чаму ўзнікае вобраз старажытнага белавежскага вешчуна. Белавежская пушча — мая мекка. Гэта месца, дзе я набіраюся сілы. Я там купіў невялікі дом. І канчаткова зразумеў, што сваё прызначэнне трэба шукаць дзесьці тут.

Ідэя ж зрабіць беларускі фармат чайнай цырымоніі нарадзілася ў Стамбуле (на міжнародным турніры ў Турцыі Аляксей заняў другое месца). Недарэмна ж класік казаў: «Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць...».


Ля «Чайнага дамка» ў Брэсце.

## НАШЫ ЗЁЛКІ НЕВЕРАГОДНА КАРЫСНЫЯ

— Самае яркае ўражанне ад міжнароднага чэмпіянату — чай, які расце на плантацыях. Я ўпершыню ўбачыў чайныя кусты. Збіраў лісточкі, еў іх сырымі, і гэта было самае моцнае перажыванне за ўсю паездку. Нарэшце я абняў чай і запоўніў пустуючае месца ў сваёй душы.

Мару прысвяціць сябе вырабу гарбат з нашых беларускіх зёлак. Як толькі пайшоў першы зялёны ліст, усёй сям'ёй мы выязджаем на прыроду і збіраем для гэтых мэт расліны. Я праводжу эксперыменты. Вынікі ўзрушальныя. Нашы зёлкі, прыгатаваныя па старажытных усходніх рэцэптах, неверагодна смачныя і карысныя. За гэтым будучыня, я ўпэўнены.

У Стамбуле па ўмовах чэмпіянату мінімум 50% павінна было быць кітайскага чаю, таму Аляксей заварваў калекцыйны шэн пуэр з яго беларускім аналагам, які зрабіў сам з бярозавага лісця. Гэты мікс прэзентаваў як беларуска-кітайскую дружбу.

— Любы ліст — грушы, ліпы — можна ператварыць ва ўнікальны прадукт, які складзе вельмі добрую канкурэнцыю кітайскаму чаю. Насамрэч я ўпэўнены, што гэта магла б быць вельмі моцная экспартная пазіцыя Беларусі, якой мы пакуль не карыстаемся. Наша краіна ва ўсім свеце ўспрымаецца, як сінявокая, чыстая. Карыстаючыся гэтым брэндам, мы маглі б вырабляць вельмі карысныя чайныя напоі. Чаму б нам не пераарыентаваць мясцовыя гаспадаркі ў прыгранічных з запаведнікамі зонах і не вырошчваць там зёлкі?

Аляксей перакананы, што няма будучыні ў беларускай чайнай культуры толькі ў кітайскім ці японскім стылі.

— Як бы ні прадстаўлялі ўсходнюю чайную цырымонію на чэмпіянатах, побач з кітайскімі ды японскімі майстрамі мы будзем выглядаць камічна. Улетку пераможца паедзе на чайны чэмпіянат у Паўднёвую Карэю. І адзіны спосаб не выглядаць камічна — гэта паказаць нашу культуру, нашу кераміку.

Так сказаў Аляксей, і праз некалькі гадзін мы даведаліся, што ён стаў адным з пераможцаў. Калі шчыра, я вельмі рада, што менавіта белавежскі вяшчун будзе прадстаўляць нашу краіну на міжнародным чэмпіянаце.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

## ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении открытого аукциона
# ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ РЕМОНТНОЙ МАСТЕРСКОЙ
## ОАО «Торгтехника»
### Стоимость объекта снижена на 80%

| **Лот № 1. Здание ремонтной мастерской (инв. № 038), расположенное по адресу: Минская обл., г. Вилейка, ул. Советская, 33** |
|---|
| Характеристика объекта: одноэтажное капитальное строение, общая площадь 47,6 кв.м, объем 188 куб.м, фундамент бутовый ленточный, стены кирпичные, кровля шиферная, имеется также гараж деревянный площадью 33 кв.м и ограждение металлическая сетка (инв. № в ЕГРНИ 631/С-61151) |
| Площадь земельного участка 0,0163 га, кадастровый номер 621350100007001421 предоставлен в постоянное пользование, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания |
| Объект продается без условий |
| Начальная цена продажи **2 860** (Две тысячи восемьсот шестьдесят) долларов США без учета НДС |
| Сумма задатка 143 (Сто сорок три) доллара США |

**Аукцион состоится 18 марта 2016 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 411.**

**Продавец объекта – ОАО «Торгтехника».**

Аукцион проводится в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже объектов недвижимости и иного имущества, утвержденным Организатором торгов.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Аукцион проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести объект. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. В ходе аукциона участники могут предлагать свою цену за продаваемый объект в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату перечисления Организатору аукциона на р/с №3012150544012 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код 369. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.*

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 9.00 до 17.00 по 17.03.2016 включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 4, оф. 411 (здание ГО «Белресурсы»).** Заключительная регистрация участников **18.03.2016 с 09.30 до 09.45** по месту проведения аукциона.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с ОАО «Торгтехника» не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи с 10.00 до 17.00. Контактный телефон продавца в г. Минске 327-36-86. Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 398-28-50, 398-29-44, 8 (029) 142 33 07; e-mail: belinvo@tut.by, на сайте belinvo.by.

*Извещение об аукционе напечатано в газете «Звязда» 31.01.2015 № 19 (27877).*

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 5 апреля 2016 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»

| № лота | Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества | Начальная цена продажи, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Общая площадь, м² | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ №1.1 | Изолированное помещение (инв. № 110/D-2750508), подземный гараж-стоянка, расположенный в подвале капитального строения (инв. №110/С-591) по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Димитрова, д. 15, пом. 67 | 10 745 100 | 1 074 510 | 1 193,9 | 3,00 | Для размещения гаража-стоянки |
| ЛОТ №2.1 | Помещение в пассажирском здании на станции Барановичи – Центральные, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Вильчковского, 3Б | 1 089 000 | 108 900 | 36,3 | 3,00 | Для организации общественного питания и/или розничной торговли |
| ЛОТ №2.2 | Помещение в пассажирском здании на станции Барановичи – Центральные, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Вильчковского, 3Б | 939 000 | 93 900 | 31,3 | 3,00 | Для организации работы общественного туалета |
| ЛОТ №2.3 | Помещение (часть пола) в пассажирском здании на станции Барановичи – Центральные, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Вильчковского, 3Б | 30 000 | 3 000 | 1,0 | 3,00 | Для размещения кофейного аппарата. Подключение электроснабжения – самостоятельно. Условия учета – согл. действующему законодательству |
| ЛОТ №2.4 | Помещение (часть пола) в пассажирском здании на станции Барановичи – Центральные, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Вильчковского, 3Б | 45 000 | 4 500 | 1,5 | 3,00 | Для размещения снек-аппарата. Подключение электроснабжения – самостоятельно. Условия учета – согл. действующему законодательству |
| ЛОТ №2.5 | Помещение (часть пола) в пассажирском здании на станции Барановичи – Центральные, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Вильчковского, 3Б | 30 000 | 3 000 | 1,0 | 3,00 | Для размещения инфокиоска. Условия организации электроэнергии – согл. действующему законодательству |
| ЛОТ №2.6 | Помещение (часть пола) в пассажирском здании на станции Барановичи – Центральные, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Вильчковского, 3Б | 36 000 | 3 600 | 1,2 | 3,00 | Для размещения банкомата с передней загрузкой, отдельно стоящий. Условия организации электроэнергии – согл. действующему законодательству |

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Право заключения договора аренды** |
| **Наименование арендодателя** | **УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги»** |
| **Срок договора** | **Не менее 3-х лет** |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будет заключен договор аренды помещения<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в рег. дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 5 апреля 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

**1.** Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях.

**2.** Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

**3.** Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**4.** Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий его полномочия).

**5.** Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

**6.** При подаче документов на участие в аукционе представители участников предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. №624, от 23.09.2011 г. №431, от 10.01.2013 г. №14) составляет 10 базовых величин.**

**Последний день приема заявлений – 4 апреля 2016 г. до 16.00.**

**Контактные тел.: 8-(0162) 20-92-13, 21-88-81 8 029 6267252.**

**23 марта 2016 г.** **ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА** **№4-А/2016**

УНП 400230163

**Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «ГОМЕЛЬГЕОДЕЗЦЕНТР» проводит повторный открытый аукцион по продаже земельных участков в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле (первоначальное извещение опубликовано в газете «Звязда» 16 января 2016 г.)**

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций | Начальная стоимость, бел. рублей | Сумма задатка, бел. рублей | Затраты на подготовку документации, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Ясная (между усадебными жилыми домами №56 и №60) | 340100000004001368 | 0,0771 | Охранные зоны линий связи и радиофикации | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 117 209 887 | 5 860 500 | 17 461 139 |
| 2 | ул. Клёнковская в районе домов №14 – №30 (со стороны «Восточного обхода») | 340100000002005663 | 1,1800 | Охранная зона линий электропередач, водоохранная зона водных объектов | для строительства и обслуживаня таунхаусов | 3 461 879 280 | 173 095 000 | 32 886 588 |

**Контактный телефон: 8 0232 41-97-86 Наш сайт – www. gorod.gomel.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об открытом аукционе по продаже апартаментов и гаражных боксов в г. Сочи, находящихся в собственности Республики Беларусь и принадлежащих ГУ «Санаторий «Беларусь» на праве оперативного управления

| № лота | Описание лотов | Начальная цена с НДС, рос. руб. | Задаток, рос. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Апартамент № 001 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1632. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -2. Площадь – 101,2 кв.м | 11 048 340 | 1 104 834 |
| Лот № 2 | Апартамент № 002 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1629. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -2. Площадь – 59,7 кв.м | 6 511 830 | 651 183 |
| Лот № 3 | Апартамент № 003 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1633. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -2. Площадь – 61,2 кв.м | 6 674 670 | 667 467 |
| Лот № 4 | Апартамент № 101 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1624. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -1. Площадь – 101,7 кв.м | 11 604 120 | 1 160 412 |
| Лот № 5 | Апартамент № 104 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1623. Назначение – нежилое. Этаж – Цокольный этаж № -1. Площадь – 100,8 кв.м | 11 336 850 | 1 133 685 |
| Лот № 6 | Апартамент № 304 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1637. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 69,4 кв.м | 8 014 560 | 801 456 |
| Лот № 7 | Апартамент № 305 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1543. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 116,7 кв.м | 13 701 570 | 1 370 157 |
| Лот № 8 | Апартамент № 306 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1545. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 98,7 кв.м | 11 588 190 | 1 158 819 |
| Лот № 9 | Апартамент № 307 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1539. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172 кв.м | 20 383 320 | 2 038 332 |
| Лот № 10 | Апартамент № 308 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1542. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 172,9 кв.м | 20 489 520 | 2 048 952 |
| Лот № 11 | Апартамент № 309 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1544. Назначение – нежилое. Этаж – 3. Площадь – 60,6 кв.м | 7 520 730 | 752 073 |
| Лот № 12 | Апартамент № 404 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1549. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 69,4 кв.м | 8 612 820 | 861 282 |
| Лот № 13 | Апартамент № 405 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1550. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 116,7 кв.м | 14 202 480 | 1 420 248 |
| Лот № 14 | Апартамент № 406 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1551. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 98,7 кв.м | 12 012 990 | 1 201 299 |
| Лот № 15 | Апартамент № 408 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1568. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 172,9 кв.м | 20 489 520 | 2 048 952 |
| Лот № 16 | Апартамент № 410 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1570. Назначение – нежилое. Этаж – 4. Площадь – 97,7 кв.м | 11 890 860 | 1 189 086 |
| Лот № 17 | Апартамент № 503 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1578. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 103,1 кв.м | 12 547 530 | 1 254 753 |
| Лот № 18 | Апартамент № 504 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1585. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 69,4 кв.м | 8 612 820 | 861 282 |
| Лот № 19 | Апартамент № 508 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1552. Назначение – нежилое. Этаж – 5. Площадь – 172,9 кв.м | 20 489 520 | 2 048 952 |
| Лот № 20 | Апартамент № 603 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1577. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 103,1 кв.м | 12 547 530 | 1 254 753 |
| Лот № 21 | Апартамент № 604 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1579. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 69,4 кв.м | 8 612 820 | 861 282 |
| Лот № 22 | Апартамент № 605 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1554. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 116,7 кв.м | 14 202 480 | 1 420 248 |
| Лот № 23 | Апартамент № 607 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1556. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,0 кв.м | 20 383 320 | 2 038 332 |
| Лот № 24 | Апартамент № 608 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1557. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 172,9 кв.м | 20 489 520 | 2 048 952 |
| Лот № 25 | Апартамент № 609 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1587. Назначение – нежилое. Этаж – 6. Площадь – 60,6 кв.м | 7 520 730 | 752 073 |
| Лот № 26 | Апартамент № 705 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1581. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 116,7 кв.м | 14 202 480 | 1 420 248 |
| Лот № 27 | Апартамент № 708 (3-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1597. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 172,9 кв.м | 20 489 520 | 2 048 952 |
| Лот № 28 | Апартамент № 709 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1599. Назначение – нежилое. Этаж – 7. Площадь – 60,6 кв.м | 7 520 730 | 752 073 |
| Лот № 29 | Апартамент № 803 (2-х комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1591. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 103,1 кв.м | 12 547 530 | 1 254 753 |
| Лот № 30 | Апартамент № 809 (1-но комнатный) с кадастровым номером 23:49:0203004:1590. Назначение – нежилое. Этаж – 8. Площадь – 60,6 кв.м | 7 520 730 | 752 073 |
